МУЖЧЫНЫ — ПРА СЯБЕ Ў ДЭКРЭЦЕ 7

ЯКІ КОШТ ВАКЦЫНАЦЫІ ЧАКАЕ СЁЛЕТА 11

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

18 ВЕРАСНЯ 2019 г. СЕРАДА № 177 (29044)

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі:

«Беларусь ужо зрабіла свой выбар на карысць развіцця нацыянальнай ядзерна-энергетычнай праграмы, рэалізацыя якой дазволіць забяспечыць трэць патрэб краіны ў даступнай і надзейнай электраэнергіі, істотна скараціць выкіды парніковых газаў. Яна ўжо дала штуршок развіццю спадарожных галін і вытворчасцяў, навуковых ведаў. Для нашай краіны пытанні ядзернай бяспекі і транспарэнтнасці маюць абсалютны прыярытэт пры рэалізацыі ядзерна-энергетычнай праграмы. Гэтаму пытанню надаецца першараднае значэнне, актыўна выкарыстоўваюцца найлепшыя сусветныя практыкі і ўвесь даступны замежны вопыт».

Пачатак новай гісторыі адносін

Беларусь і ЗША ўпершыню з 2008 года абмяняюцца пасламі

Фота БелТА.

Аб гэтым падчас перагавораў з Прэзідэнтам Беларусі заявіў намеснік дзяржаўнага сакратара Злучаных Штатаў Амерыкі па палітычных пытаннях Дэвід Хэйл. Гэта не першы візіт у Мінск высокапастаўленых палітыкаў з ЗША. У канцы жніўня Аляксандр Лукашэнка сустракаўся з Джонам Болтанам, дарадцам (ужо былым) па нацыянальнай бяспецы прэзідэнта ЗША. Нагадаем, тады кіраўнік дзяржавы адзначыў, што сустрэча гістарычная, і прапанаваў пачаць адносіны краін з новага ліста. На тых перагаворах абмяркоўвалі розныя тэмы, але разам з тым да канкрэтных рашэнняў не прыйшлі. Прыезд Дэвіда Хэйла — чым не яшчэ адзін знак, што амерыканскі бок таксама згодны перагарнуць старонку і пачаць пісаць новую гісторыю двухбаковага ўзаемадзеяння?

«Спадар Хэйл, прыемна вас бачыць тут — не толькі ў Беларусі, але і ва Усходняй Еўропе. Я з задавальненнем хачу адзначыць, што гэта сведчанне таго, што Злучаныя Штаты нарэшце звярнулі ўвагу не толькі на Еўропу ў цэлым, але і на Беларусь. У гэтыя складаныя часы ваш інтарэс да гэтага рэгіёна абнадзейвае», — вітаў Аляксандр Лукашэнка госця.

Прэзідэнт адзначыў, што Еўропа і планета ў цэлым перажывае нялёгкія часы, складаныя часы і, бывае, ва ўскладненні абстаноўкі абвінавачваюць ЗША. «Але мы добра разумеем, што не бывае так у жыцці, каб адзін нехта быў вінаваты, — сказаў кіраўнік Беларусі. — Мабыць, тут мы ўсе вінаватыя, што складваецца такая сітуацыя ў свеце».

Візіт Дэвіда Хэйла дасць магчымасць беларусам і кіраўніцтву дзяржавы больш аб'ектыўна паглядзець на свет, зыходзячы з той інфармацыі, якую разлічвае атрымаць Аляксандр Лукашэнка ад госця.

Прэзідэнт паведаміў, што Беларусь як удзельніка Дагавора аб ракетах малой і сярэдняй далёкасці цікавіць нядаўняя інфармацыя, што ні НАТА, ні Расія не збіраюцца размяшчаць у Еўропе гэтую зброю. «Я ў сваю чаргу нядаўна сказаў пра тое, што мы ні ў якім разе не будзем ініцыятарамі нядобрых спраў па разбурэнні гэтага Дагавора. І больш за тое, мы ніколі не станем такія ракеты размяшчаць на тэрыторыі Беларусі, калі не будзе пагрозы нашай бяспецы. Але і з Захаду, і з Усходу запэўніваюць мяне ў тым, што нам, Беларусі, не прыйдзецца прыбягаць да гэтых крайніх мераў. На гэта ў нас няма ні жадання, ні лішніх грошай, таму што гэта нятаннае мерапрыемства», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

Па палічках

ЧАКАЦЬ НЕЛЬГА ЎКЛАСЦІ

Ці атрымаюць беларусы дывідэнды з чэкаў «Маёмасць» і на што яны прыдатныя цяпер

Ледзьве не ў кожнай сям'і дагэтуль ляжаць дзяржаўныя сертыфікаты з выявай Мірскага замка і Пагоні з надпісам «Маёмасць». Для большасці гэта ўжо, хутчэй, сувенір з мінулага, аднак многія яшчэ памятаюць, што каштоўныя паперы можна абмяняць на акцыі прадпрыемстваў. Некаторыя ж імкнуцца ўвогуле выменяць іх на грошы. Ці можна гэта зрабіць, куды ўкласці сертыфікаты і ці варта чакаць да 2021-га, калі тэрмін абарачэння чэкаў скончыцца і можна будзе атрымаць за іх ад дзяржавы кампенсацыю? Усе гэтыя пытанні хвалююць нашага чытача Антона Жука з Нясвіжскага раёна, які мае 121 чэк, і, думаю, будзе не лішнім нагадаць пра гэта іншым беларусам, на руках якіх засталося 40 % з выпушчаных 427 мільёнаў сертыфікатаў.

СЕРТЫФІКАТЫ — НА АКЦЫІ... «ПА ПРАПІСЦЫ» І СВАЯЦТВЕ

Чэкі «Маёмасць» з'явіліся ў Беларусі ў 1993 годзе падчас прыватызацыі. Да 1997-га іх маглі атрымаць ледзьве не ўсе паўналетнія беларусы і ўкласці паперы ў акцыі дзяржаўных прадпрыемстваў. Сертыфікаты атрымалі 4,9 мільёна чалавек, а 37 % беларусаў (2,9 млн), якія мелі права на набыццё, не патурбаваліся зрабіць гэта.

СТАР. 2

КАРОТКА

• «Белкамунмаш» распрацаваў першы ў СНД праварульны электробус. Ён будзе прадстаўлены на выстаўцы Coach & Bus Live 2019 2—3 кастрычніка ў Бірмінгеме (Вялікабрытанія).

• **Панда Бін Двэнь Двэнь у касцюме з лёду стала афіцыйным талісманам зімовых Алімпійскіх гульняў 2022 года ў Пекіне.**

Малы флот беларускіх вадаёмаў

Фота Анатоля КЛЕШНУКА.

Фота носіць ілюстрацыйны характар.

Якую лодку не трэба рэгістраваць

Восень — час, калі на рэках і азёрах краіны пакрысе сціхае актыўнасць. Лодкі, катары і іншыя плавальныя сродкі адпраўляюцца на захоўванне да вясны. Таму можна ўжо цяпер падводзіць вынікі іх сезоннай эксплуатацыі. А заадно — і адказаць на пытанні тых, хто плануе набыць сабе штосьці для падарожжа па рэках і азёрах на наступны год. Пра ўсё гэта «Звяздзе» расказаў начальнік Дзяржаўнай інспекцыі па маламерных суднах Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Міхаіл ЧАШУН.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» — і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на IV квартал 2019 года

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ – БУДЗЕ ЦІКАВА!

Пачатак новай гісторыі адносін

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Адносна праблем Усходняй Еўропы, беларускі лідар адзначыў, што ўрэгуляваць канфлікт ва Украіне немагчыма без удзелу ЗША: «Я абсалютна ўпэўнены на сённяшні дзень, што без удзелу Злучаных Штатаў Амерыкі гэты канфлікт урэгуляваць не атрымаецца. Гэта азбука дыпламатыі, калі не атрымліваецца ў перамоўшчыкаў нешта, трэба падключаць новыя сілы, новыя ідэі павінны з'явіцца. Думаю, што Злучаныя Штаты Амерыкі маглі б садзейнічаць урэгуляванню гэтага канфлікту».

Прэзідэнт звярнуў увагу: у сучасным свеце ненармальна, калі дзве дзяржавы, якія калісьці ваявалі супраць аднаго ворага, сёння маюць такія слабыя адносіны. «Мы, канешне, будзем рабіць усё, для таго, каб нашы адносіны развіваліся», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Дэвід Хэйл перадаў прывітанне Прэзідэнту ад дзяржаўнага сакратара ЗША Майка Пампеа, які накіраваў яго для прысутнасці на значнай падзеі для дзвюх краін: «Пасля нашай сустрэчы мы будзем рабіць аб'яву пра тое, што мы будзем абменьвацца пасламі пасля такой колькасці гадоў без паслоў. Мы згодныя з вамі, што такі стан рэчаў ненатуральны, ненармальны, і мы рады, што гэта глава заканчваецца», — сказаў дыпламат.

Ён падкрэсліў, што падтрымлівае бачанне Беларусі ва ўнутраных справах, знешніх адносінах, і выказаў рашучасць дапамагчы краіне на гэтым шляху.

«Мы гэта робім не для спаборніцтва з нейкай іншай дзяржавай, а ў мэтах таго, каб патэнцыял нашых адносін быў рэалізаваны ў поўнай меры, і таксама таму, што нам вельмі дарагі гэты рэгіён і мы вельмі ўважліва ставімся да пагроз бяспецы, і таму, што мы вельмі падтрымліваем суверэнітэт і незалежнасць Беларусі», — заявіў намеснік дзяржаўнага сакратара ЗША.

● У тэму

Намеснік дзяржсакратара ЗША:

«МЫ НЕ ПРОСІМ БЕЛАРУСЬ РАБІЦЬ ВЫБАР ПАМІЖ УСХОДАМ І ЗАХАДАМ»

Намеснік дзяржаўнага сакратара ЗША таксама правёў перагаворы з міністрам замежных спраў Беларусі Уладзімірам Макеем. Пасля гэтага Дэвід Хэйл і кіраўнік беларускага МЗС выступілі з заявамі для журналістаў.

«Мы абмеркавалі шырокі спектр міжнародных адносін, у тым ліку і самыя чуллівыя пытанні — палітычныя, аб правах чалавека і пытанні эканамічнага дыялогу. І павінен канстатаваць, што сённяшнія перагаворы прайшлі ў атмасферы абсалютнай адкрытасці і ўзаемнага даверу», — паведаміў Уладзімір Макей.

Абмеркавалі дыпламаты не толькі сучасны стан узаемадзеяння, але і перспектыўныя сферы, якія дапамогуць выйсці партнёрству на новы ўзровень. Па словах кіраўніка знешнепалітычнага ведамства Беларусі, палітык такога высокага рангу з Дзяржаўнага дэпартамента ЗША прыязджае да нас упершыню за 25 гадоў.

«Ёсць адчуванне таго, што ўзаемнае прадстаўніцтва дзвюх краін у Вашынгтоне і Мінску на ўзроўні часовых павераных у справах ужо не адпавядае рэаліям сённяшняга дня і патрабуе карэкціроўкі. І больш высокі ўзровень прадстаўніцтва мог бы дазволіць эфектыўней рэалізаваць тыя магчымасці, якія сёння адкрываюцца перад нашымі краінамі», — упэўнены міністр замежных спраў.

Па выніках перагавораў Уладзімір Макей адзначыў агульную зацікаўленасць у далейшым паглыбленні развіцця двухбаковых адносін і выказаў гатоўнасць далей рухацца ў гэтым кірунку.

Па словах Дэвіда Хэйла, настаў гістарычны момант у беларуска-амерыканскіх адносінах: «Я рад прыняць удзел у абвяшчэнні нашай гатоўнасці да абмену пасламі як наступнага кроку па нармалізацыі нашых стасункаў. Злучаныя Штаты застаюцца прыхільнікамі падтрымкі суверэнітэту і незалежнасці Беларусі, дзе наступныя пакаленні будуць мець паспяховую будучыню».

Амерыканскі бок таксама вітае пашырэнне супрацоўніцтва ў пытаннях нераспаўсюджання ядзернай зброі, бяспекі на мяжы, эканомікі і абмену інфармацыяй у сферы агульнай бяспекі.

«Нармалізуючы нашы стасункі, мы не просім Беларусь рабіць выбар паміж Усходам і Захадам. Злучаныя Штаты паважаюць жаданне Беларусі вызначаць свой уласны шлях і рабіць уласны ўнёсак у мір і стабільнасць у рэгіёне», — сказаў намеснік дзяржаўнага сакратара ЗША.

Марыя ДАДАЛКА.

СПРАВА ДЗЯРЖАЎНАЙ ВАЖНАСЦІ

Аляксандр Лукашэнка падпісаў Указ № 343 «Аб дзейнасці Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь».

«Указ распрацаваны ў мэтах выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы, дадзеных у ходзе даклада рэктара Акадэміі кіравання 24 ліпеня 2018 года, а таксама для прывядзення ў адпаведнасць з дзеючым заканадаўствам нарматыўных прававых актаў, якія рэгулююць дзейнасць навучальнай установы, і накіраваны на далейшае яе ўдасканаленне», — паведамляе прэс-служба Акадэміі кіравання.

Указам зацвярджаецца новая рэдакцыя Статута, удакладнены прадмет дзейнасці Акадэміі кіравання, карэктуюцца задачы і функцыі, ускладзеныя на яе, змяняюцца падыходы да фарміравання яе структуры.

У Статуце замацоўваецца права Акадэміі кіравання ўжываць модульны прынцып прадстаўлення зместу адукацыйнай праграмы ў вучэбна-праграмнай дакументацыі. Таксама зацверджана Палажэнне аб падрыхтоўцы, перападрыхтоўцы, стажыроўцы і павышэнні кваліфікацыі ў адпаведнасці з дзяржаўным заказам, у якім прадугледжаны шэраг абноўленых падыходаў да падрыхтоўкі кіруючых кадраў.

Удакладнены этапы фарміравання і віды адукацыйных праграм дзяржаўнага заказу на навучанне кіруючых кадраў і іх рэзерву. Удасканальваецца сістэма адбору кандыдатур для навучання ў Акадэміі кіравання. «Прыняцце гэтай нормы будзе садзейнічаць павышэнню зацікаўленасці ў навучанні як з боку арганізацыі, якая накіравала работніка на навучанне, так і самога работніка, а таксама прадухіліць нямэтавае расходаванне бюджэтных сродкаў», — лічаць распрацоўшчыкі дакумента.

У дачыненні да найбольш здольных слухачоў Акадэміі кіравання будуць выпрацоўвацца прапановы па выкарыстанні іх кіраўніцкага патэнцыялу ў сістэме дзяржаўных органаў.

У мэтах павышэння матывацыі моладзі да навучання ў Акадэміі кіравання павялічаны памер стыпендый студэнтаў. Прадугледжваюцца меры па прыцягненні да выкладчыцкай дзейнасці найлепшых прафесарска-выкладчыцкіх кадраў і спецыялістаў-практыкаў у сферы дзяржаўнага кіравання.

«Рэалізацыя ўказа дасць магчымасць прывесці дзейнасць Акадэміі кіравання ў адпаведнасць з сучаснымі задачамі па падрыхтоўцы рознабакова адукаваных, высокакваліфікаваных і ідэалагічна дасведчаных кіраўнікоў», — каментуе дакумент прэс-служба Прэзідэнта.

«Па сутнасці справы, мы разглядаем магчымасць выхаду з класна-ўрочнай сістэмы работы з такой катэгорыяй слухачоў, іх замацавання за тым ці іншым кіраўніком дзяржоргана», — кажа рэктар Акадэміі кіравання Генадзь Пальчык. Ён растлумачыў, што гаворка ідзе пра свайго роду работу дублёрам непасрэдна ў дзяржоргане, арганізацыі.

«Гэта абсалютна новы крок, і мы разглядаем яго па ўзгадненні з Міністэрствам адукацыі як своеасаблівы рэспубліканскі эксперымент», — падкрэсліў рэктар.

Генадзь Пальчык адзначыў, што прыняцце ўказа — найважнейшы этап развіцця сістэмы бесперапыннай прафесійнай падрыхтоўкі кадраў у сферы кіравання. Дакумент комплексна рэгулюе дзейнасць акадэміі, вядучай установы адукацыі ў Беларусі па падрыхтоўцы кіруючых кадраў.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

ЧАКАЦЬ НЕЛЬГА ЎКЛАСЦІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Сёння вызначаны тэрмін заканчэння абмену чэкаў на акцыі — да 31 снежня 2020-га. Пасля — толькі кампенсацыя ад дзяржавы. Аднак «час Х» ужо неаднаразова пераносіўся, а сума грошай на кампенсацыю за чэкі, калі пералічваць яе па намінале сертыфікатаў, што быў устаноўлены ў 90-я, вызначалася б мільярдамі. На такі подзвіг бюджэт не здольны... Хіба што ў пераліку на дэнамінаваныя грошы. Што рабіць і чаго чакаць, «Звязда» пацікавілася ў **Андрэя НАГОРНАГА, кансультанта ўпраўлення ўладальніцкага нагляду і абарачэння акцый Дзяржкаммаёмасці.**

Першае, што можна зрабіць, — абмяняць чэкі на акцыі дзяржпрадпрыемстваў.

Тым больш што пасля чарговага прадаўжэння тэрміну абмену чэкаў на акцыі (меркавалася, што гэтая магчымасць знікне сёлета 30 чэрвеня) камітэт змясціў на сваім сайце спіс акцыянерных арганізацый, у якія можна ўкласці свае імянныя паперы. Праблема толькі ў тым, што трэба ўлічваць месца вашага жыхарства. У аддзяленні Беларусбанка па месцы рэгістрацыі чалавека можна атрымаць спіс прадпрыемстваў, куды ўкласці чэкі, аднак гэта не значыць, што гэтыя арганізацыі атрымліваюць вялікі прыбытак або ўвогуле будуць здольныя выплачваць наваспечанаму акцыянеру нейкія грошы. Так што разлічваць на абавязковыя дывідэнды і тым больш разглядаць іх як дадатковы капітал не прыходзіцца.

Яшчэ адзін шлях рэалізаваць чэкі — прадаць іх, аднак у гэтым выпадку скарыстацца паперамі новы ўладальнік зможа толькі на чэкавым аўкцыёне (калі ён будзе праводзіцца), як сродкам плацяжу. Набыць за іх акцыі ў Беларусбанку ці атрымаць кампенсацыю будзе немагчыма.

Каб усё ж выкарыстаць сертыфікаты і стаць акцыянерам, неабходныя імянныя чэкі або атрыманыя ў дар ці спадчыну, прычым толькі ад сваякоў: сваёй другой паловы, цешчы, бацькі, дзяцей, брата і іншых родных. Аднак злоўжываць атрыманнем сертыфікатаў не варта, паколькі кожны беларус зможа абмяняць на акцыі не больш як 250 чэкаў, перааформленых на яго роднымі. Падараныя чэкі, дарэчы, неабходна перааформіць на імя новага ўладальніка ў Беларусбанку, заплаціўшы за працэдуру 0,03 базавай велічыні (75 капеек).

44 КАПЕЙКІ І 167 МІЛЬЁНАЎ

Цяперашні намінал сертыфіката — 44 капейкі, хоць на момант яго ўстанаўлення ў 2005-м лічба складала 4400 рублёў. Гэтая велічыня ў свой час выкарыстоўвалася Дзяржкаммаёмасцю, каб падлічыць, колькі чэкаў браць за адну акцыю прадпрыемства. Напрыклад, за адну акцыю арганізацыі МАПІД трэба аддаць адзін чэк, а за акцыю, скажам, кампаніі «Гомельтранс» — дзесяць. Так што гэта зусім не кошт чэка і не азначае, што за яго можна будзе атрымаць толькі 44 капейкі, як лічаць некаторыя ўладальнікі сертыфікатаў, але і не 4400 рублёў, гаворыць спецыяліст:

— Калісьці даўно існавала рэдакцыя закона аб чэках, дзе вызначалася, што чэк будзе індэксавацца па кошцы, які меўся на дату завяршэння выдачы, — на той момант гэта было 100 рублёў (да апошняй дэнамінацыі). Сёння гэта была б адна капейка. Пасля гэты пункт адтуль прыбралі. Цяпер кошту чэка, па якім можа быць зроблена індэксацыя, проста не існуе. У сярэднім у людзей цяпер на руках па 85 імянных чэкаў.

А наогул, на руках у грамадзян цяпер 167 мільёнаў нявыкарыстаных чэкаў, за якія заканадаўча прадугледжана налічэнне кампенсацыі.

— Думаю, выходзячы з магчымасцяў бюджэту і кіруючыся інфармацыяй ад Міністэрства фінансаў, мы прыдумаем нейкі механізм паэтапнасці выплат, расцягнуўшы іх на два-тры гады. Скажам, спачатку кампенсуюць сумы грамадзянам, старэйшым за 50 гадоў, пасля — 40-гадовым і гэтак далей. Што будзе з вынікамі чэкаў, як іх спісаць, па якім кошце (90-х гадоў ці сучасных) выдаваць кампенсацыю — усё гэта будзе прадугледжана ў адпаведнай пастанове, якая, магчыма, і з'явіцца налета, — кажа Андрэй Нагорны.

Калі рашэнне аб выплатах кампенсацый будзе ўсё ж афіцыйна зацверджана, тэрмін валодання чэкамі не будзе мець значэння пры налічэнні сумы, мяркуе спецыяліст. Тым больш што розныя варыянты выплаты па чэках неаднаразова прадумваліся. Імі прапаноўвалася, напрыклад, дазволіць разлічвацца за камунальныя паслугі ці аплачваць пэўныя тавары. Аднак найбольш верагодным сцэнарыем застаецца, як і раней, кампенсацыя.

Аднак чакаць яе, трымаючы чэкі пры сабе, і бегчы 1 студзеня 2021 года займаць чаргу на атрыманне грошай таксама не варта. Ніякай кампенсацыі ўвогуле можа не адбыцца, і сертыфікаты стануць проста звычайнай паперай — такі варыянт не проста не выключаны, а падаецца найбольш верагодным. Праект закона, якім прадугледжана адмена кампенсацыі, змешчаны на прававым партале, аднак пакуль не мае юрыдычнай сілы.

— Ёсць у вас чэкі — ідзіце і абмяняйце іх на акцыі, выбраўшы з пераліку прадпрыемстваў тое, што падыходзіць пад месца вашай рэгістрацыі, — раіць спецыяліст Дзяржкаммаёмасці. — Акцыя заўжды застаецца акцыяй, калі толькі арганізацыя не абанкруціцца. А чэк проста прападзе.

Ірына СІДАРОК.

Новы праект

НА «АРТ-ПАРАД» У ВІЦЕБСК

Кіраўнік дырэкцыі міжнароднага фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» Глеб Лапіцкі прэзентаваў новы праект. Яго рэалізуюць на пачатку наступнага года. Нагадаю, што традыцыйна фэст праводзяць у ліпені. Цяпер «міні-базар» будзе правіць бал і зімой. Цікавых задумак шмат.

Міжнародны фестываль-конкурс «Арт-парад у Віцебску» ўпершыню правядуць 8—10 студзеня 2020 года пры падтрымцы гарвыканкама.

Паводле слоў Глеба Лапіцкага, «Славянскі базар» — брэнд, вядомы ва ўсім свеце, таму прыехаць у Віцебск на творчую акцыю пажадаюць многія.

У конкурснай праграме будуць удзельнічаць творчыя калектывы і выканаўцы ва ўзросце ад 7 да 25 гадоў. Яны змогуць прадэманстраваць талент у вакальным і харэаграфічным майстэрстве. З канкурсантамі будзе працаваць творчая каманда дырэкцыі «базару», пачынаючы ад гукарэжысёра да харэографа...

Уладальнік галоўнага прыза ў кожнай з намінацый будзе гарантавана запрошаны выступіць на міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Таму, зразумела, стаць пераможцам конкурсу «Арт-парад у Віцебску» вельмі ганарова.

Цэнтральнай пляцоўкай дзеі стане канцэртная зала «Віцебск».

Задумана, што ўсё будзе «па-базарнаму». І гэта не толькі дасць магчымасць патэнцыйным удзельнікам «вялікага базару» прасякнуцца атмасферай самай маштабнай і яркай музычнай падзеі ў Беларусі, але і натхніць на перамогу ў нацыянальным адборы сваёй краіны, каб прыехаць у Віцебск у якасці канкурсанта. І канешне ж, вялікім плюсам будзе вопыт выступлення на адной з «базарных» пляцовак.

Фота БелТА.

Падчас творчага выпрабавання ў складзе журы «Арт-парад у Віцебску» будуць пераважна пераможцы конкурсаў вакалістаў фестывалю. Галасаванне будзе адкрытае: адразу пасля выступлення суддзі выставяць балы.

Наогул, адна з мэт новага праекта — каб тыя, хто стаў знакамітым на «базары», дзяліліся сакрэтамі поспеху з пачаткоўцамі. Плануецца, што ў праграме будуць майстар-класы, творчыя сустрэчы, вечарынкі...

Дакладна вядома, што фестываль будзе мець фармат трохдзённага чароўнага зімовага мюзікла. І творчая казка надоўга запомніцца людзям розных узростаў і густаў. Пры гэтым арганізатары анансавалі інтэрактыўнае відовішча. Як гэта і што будзе дакладна — стане вядома падчас рэалізацыі задуманага.

Для ўдзелу ў праекце неабходна падаць інфармацыю пра сябе на адрас электроннай пошты: ARTparad.vitebsk@gmail.com. Заяўкі прымаюцца да 15 снежня.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Конкурс

«ВЫКАРЫСТОЎВАЮ САБАКУ!»

На базе Цэнтра павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Дэпартамента аховы МУС праходзіць агляд-конкурс сярод найлепшых супрацоўнікаў. Сваё майстэрства ў першы дзень паказалі навучэнцы спецыялізаванага ліцэя Міністэрства ўнутраных спраў. Але сапраўднае відовішча чакала гледачоў пасля. Кіналагічныя разлікі пераадольвалі спецыяльную паласу перашкод і затрымлівалі ў лабавой атацы ўмоўнага праціўніка.

— Агляды-конкурсы штогод праходзяць ва ўсіх структурных падраздзяленнях ведамства, — расказаў **намеснік міністра ўнутраных спраў — начальнік міліцыі грамадскай бяспекі МУС Мікалай МЕЛЬЧАНКА.** — Дэпартамент аховы — не выключэнне. Тут працуюць людзі, якія ў першую чаргу выбываюць на затрыманне злачынцаў. Пакрысе выходзім і на міжнароднае супрацоўніцтва. Сёлета паназіраць за нашым конкурсам прыехалі госці з Сербіі, Таджыкістана, Узбекістана і Кыргызстана.

Хутчэй за ўсіх паласу перашкод прайшоў малодшы інспектар-кінолаг гадавальніка службовых сабак Гомельскага абласнога ўпраўлення старшына Станіслаў Тарасенка разам са сваім выхаванцам па мянушцы Нэльсі.

— Для сабакі было трохі складана пераадольваць двухметровую лесвіцу, — кажа міліцыянер. — Мне ж лёгка было паўсюль — а інакш і быць не можа, калі хочаш паказаць найлепшы вынік у параўнанні з іншымі. Нам трэба быць фізічна лепш падрыхтаванымі за злачынцу.

Вынікі конкурсу будуць падведзены ў пятніцу. Пераможца атрымае ў якасці галоўнага прыза аўтамабіль.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Здарэнні

ВЫНЕС З ЧУЖОГА ДОМА ЗАПЛЕЧНІК

Ды не абы-які, а з буйной сумай грошай

Паведамленне аб крадзяжы паступіла яшчэ 26 жніўня ў дзве гадзіны ночы ад 34-гадовага непрацуючага жыхара Калінкавіч. Напярэдадні познім вечарам гаспадар прыватнага дома сустракаўся з таварышамі, пасля іх сыходу дзверы не зачыніў. А другой гадзіне ночы ён звярнуў увагу, што знікла сумачка жонкі, якая знаходзілася каля дзвярэй. Пасля нядоўгіх пошукаў яе знайшлі недалёка ад уваходу ў хату. Але ў ёй хтосьці паспеў пагаспадарыць — прапаў залаты пярсцёнак. А калі на вуліцы выявілі прыстаўленую да плота лаўку, зразумелі, што дом наведваў няпрошаны госць.

Як паведамляе УУС Гомельскага аблвыканкама, гаспадар тут жа кінуўся ў зацішнае месца ў пакоі, дзе трымаў у заплечніку немалыя зберажэнні. Але таго там не аказалася. Праваахоўнікам, што прыехалі па выкліку, ён распавёў, што там знаходзілася 5000 долараў ЗША, 25 000 беларускіх і 300 000 расійскіх рублёў. У эквіваленце — больш за 21 тысячу долараў.

Аператыўнікі ўпраўлення крымінальнага вышуку УУС з калегамі з РАУС правялі значны аб'ём работы па ўстанаўленні асобы злачынцы. І хоць падазрэнне выпала на аднаго з раней судзімых за крадзеж, што летась вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі, прамых доказаў яго дачынення да крадзяжу адразу здабыць не ўдалося. Ды і сам ён, пачуўшы пэўную цікавасць да яго з боку сышчыкаў, затаіўся.

Днямі жыхар Калінкавіч прыехаў у Гомель на кансультацыю ў абласную клінічную бальніцу. А затым, пагуляўшы па горадзе, зайшоў у аддзяленне банка. А на выхадзе яго ўжо чакалі супрацоўнікі міліцыі. Даставіўшы ў РАУС, дагледзелі змесціва заплечніка. А там — 6 тысяч долараў і каля 2 тысяч беларускіх рублёў. Перад такімі доказамі 39-гадовому мужчыну нічога не заставалася, як прызнацца ў здзяйсненні крадзяжу.

Частка выкрадзенага канфіскавана. Пэўную суму зламыснік паспеў патраціць на элітнае спіртное і прадукты, дарыў кветкі дзяўчатам і нават даў у доўг знаёмаму.

ЭВАКУІРАВАЛІ БОЛЬШ ЗА 1300 ЧАЛАВЕК

У школе адбылося кароткае замыканне.

Ранкам паступіла паведамленне аб магчымым узгаранні ў СШ на вуліцы Панамарова ў Мінску. У будынку спрацавала пажарная сігналізацыя, якая перадала інфармацыю ў цэнтр аператыўнага ўпраўлення МНС сталіцы. Калі да месца выкліку прыбылі падраздзяленні ратавальнікаў, высветлілася, што адбылося аплаўленне ізаляцыі электраправаднікоў ў электрашчытавой на першым паверсе. Адміністрацыяй школы да гэтага моманту ўжо былі эвакуіраваны 53 класы школьнікаў (1250 дзяцей) і 100 настаўнікаў і членаў персаналу школы.

Пажар быў ліквідаваны да прыбыцця ратавальнікаў: у электрашчыце адбылося самазатуханне. Як мяркуецца, прычына здарэння — кароткае замыканне. Ніхто не пацярпеў.

АБКРАДАЎ КАВАВЫЯ АЎТАМАТЫ

На працягу доўгага часу гэтым займаўся раней не судзімы непрацуючы 23-гадовы мінчанін. Яго затрымалі супрацоўнікі Цэнтральнага РУУС сталіцы.

Праваахоўнікам малады чалавек растлумачыў, што адкрываў кававыя аўтаматы пры дапамозе ключа, які раней знайшоў каля аднаго з апаратаў. Вядома, што такім чынам у хлопца атрымалася выкрасці каля 1400 рублёў з чатырох кававых аўтаматаў. Выкрадзеныя грашовыя сродкі ён выдаткаваў на ўласныя патрэбы, паведамілі ў ГУУС Мінгарвыканкама.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Дзейнасць Зяленскага адабраюць 70 % украінцаў

Больш за 70 % украінцаў станоўча ацэньваюць дзейнасць прэзідэнта краіны Уладзіміра Зяленскага. Пра гэта сведчаць апублікаваныя дадзеныя апытання, якое правёў цэнтр імя Аляксандра Разумкова.

Паводле яго даных, незадаволеных работай кіраўніка дзяржавы ўсяго 9 %. У той жа час 44 % апытаных задавальняе дзейнасць новай Вярхоўнай Рады, тады як кожны дзясяты незадаволены ёю. Апытанне паказала, што 57 % грамадзян лічаць, што падзеі ў краіне развіваюцца ў правільным кірунку, 17 % прытрымліваюцца супрацьлеглага меркавання. 41 % рэспандэнтаў сказалі, што Украіна здольная пераадолець існуючыя праблемы і цяжкасці на працягу бліжэйшых некалькіх гадоў.

Сярод дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў часцей за ўсё давер выяўляецца да прэзідэнта Украіны, якому давяраюць 79 % апытаных, арміі (74 %), валанцёрскім арганізацыям (69 %), дзяржслужбе па надзвычайных сітуацыях (64 %), Нацгвардыі (64 %), царкве (63 %), пагранічнай службе (63 %), ураду (57 %), Вярхоўнай Радзе (57 %), украінскім СМІ (56 %), грамадскім арганізацыям (52 %), паліцыі (51 %).

У Ізраілі прайшлі першыя ў гісторыі краіны паўторныя парламенцкія выбары

Па выніках парламенцкіх выбараў павінен быць сфарміраваны склад Кнесета 22-га склікання, а таксама павінна быць сфарміравана ўрадавая кааліцыя і прызначаны прэм'ер-міністр.

Усяго на тэрыторыі яўрэйскай дзяржавы арганізавана каля 10,5 тысячы ўчасткаў для галасавання. Па звестках уладаў, у Ізраілі на гэтых выбарах змаглі прагаласаваць больш за 6,3 мільёна чалавек.

Паўторныя парламенцкія выбары праводзяцца ў Ізраілі з-за таго, што прэм'ер-міністр Біньямін Нетаньяху пасля папярэдняга волевыяўлення 9 красавіка не змог у адведзены яму законам 42-дзённы тэрмін дамовіцца аб стварэнні кааліцыі, якая кантралявала б мінімальна неабходныя 61 са 120 месцаў у Кнесеце 22-га склікання. У выніку кіраўнік урада ініцыяваў і правёў праз парламент закон аб самароспуску найвышэйшага заканадаўчага органа роўна праз месяц пасля прысягі дэпутатаў.

Паводле апошніх апытанняў грамадскай думкі, як і перад выбарамі 9 красавіка, асноўнымі прэтэндэнтамі на перамогу з'яўляюцца партыя «Лікуд» Нетаньяху і цэнтрысцкі блок партый «Кахоль-Лаван» (блок «Бела-блакітныя», названы так па колерах ізраільскага сцяга) на чале з былым кіраўніком генштаба ізраільскай арміі Бені Ганцам.

На патэнцыйна заселенай планеце ўпершыню выяўлена вада

Астраномы ўпершыню выявілі ваду ў атмасферы планеты K2-18b, якая верціцца вакол сваёй зоркі ў так званай заселенай зоне. У спалучэнні са спрыяльнай тэмпературай гэта азначае, што на планеце можа быць жыццё.

Новыя касмічныя тэлескопы ў наступныя 10 гадоў, як запэўніваюць вучоныя, змогуць вызначыць, ці выдзелены газы, што змяшчаюцца ў атмасферы K2-18b, жывымі арганізмамі.

Прафесар Джавана Цінеці з універсітэцкага каледжа Лондана, якая займалася даследаваннем, называе адкрыццё «ашаламляльным». «Упершыню мы выявілі ваду на планеце, размешчанай у заселенай зоне, дзе тэмпература дапускае прысутнасць жыцця», — кажа яна.

Камп'ютарнае мадэляванне дазваляе выказаць здагадку, што да 50 % атмасферы гэтай планеты складаецца з вады. Гэтая планета ўсяго ўдвая большая за Зямлю, тэмпература на ёй — паміж 0 і 40 градусамі Цэльсія — дазваляе вадзе заставацца ў вадкім стане.

«Гэтае адкрыццё набліжае нас да адказу на фундаментальнае пытанне: ці ўнікальная Зямля?» — кажа доктар Ангелас Цыярас, які ўдзельнічаў у даследаванні.

Умовы на K2-18b могуць быць прыдатныя для жыцця, але цяпер напэўна пацвердзіць гэтую гіпотэзу немагчыма. Планета знаходзіцца на адлегласці 111 светлавых гадоў ад Зямлі, гэта занадта далёка для запуску туды зонда. Адзінае, што застаецца, — дачакацца з'яўлення ў 2020-х гадах новага пакалення касмічных тэлескопаў, якія змогуць прааналізаваць склад газаў у атмасферы K2-18b і ўстанавіць, ці ёсць у атмасферы планеты хімічныя элементы, выраблены жывымі істотамі.

Малы флот беларускіх вадаёмаў

«Не барты, а адны дзіркі»

— У краіне цяпер налічваецца больш за 350 тысяч суднаў, якія нам паднаглядныя. Больш за 150 тысяч з іх — тыя, якія падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі і тэхагляду.

Тут трэба звярнуцца да лічбаў. Маламернае судна ў нашай краіне лічыцца такім, зыходзячы з таго, што яго даўжыня не перавышае 20 метраў і яно можа ўзяць адначасова на борт не больш за 12 чалавек. Амаль усе такія транспартныя сродкі неабходна рэгістраваць. Адзінае выключэнне — калі лодка на вёслах і мае грузападымальнасць да 225 кілаграмаў. Якіх-небудзь пытанняў з рэгістрацыяй лодак, выпушчаных у замежжы, няма. Галоўнае — каб яе гаспадар меў поўны пакет дакументаў. Таму што нават пры куплі-продажы лодкі тэхагляд пачынаецца зноў.

Праходзіць праз гэтую працэдуру маламерныя судны павінны па-рознаму. Калі гаворка ідзе пра звычайную вёславую лодку, то першыя 10 гадоў пасля набыцця прывозіць да інспектараў яе трэба раз на пяць гадоў. Для прылад з маторам устаноўлены больш жорсткі тэрмін — раз на тры гады. Лодка, якая размяняла дзесяць гадоў, мусіць абследавацца штогод. Усё астатняе — парусныя лодкі, гідрацыклы, катары — трэба правяраць раз на два гады. Рубеж у 10 гадоў вызначальны і тут — пасля гэтага кантроль становіцца штогадовым.

— Пры правільным захоўванні і эксплуатацыі 10 гадоў для судна — не ўзрост, — сцвярджае суразмоўнік. — Дагэтуль у нашых людзей ёсць плывучыя транспартныя сродкі, якія былі выпушчаны яшчэ ў СССР. У нас ёсць ва ўласнасці судна «Амур-2М», якое знаходзіцца ў страі наогул з 1972 года. Маторная лодка з рухавіком магутнасцю ў 90 конскіх сіл яшчэ цалкам прыдатная да эксплуатацыі. Але мы не раз сутыкаліся з дзіўнымі выпадкамі. Купіў чалавек, скажам, маторную лодку. Ён яе ў нас зарэгістраваў, праз тры гады прывёз на тэхнічны агляд, а мы дазвол даць не можам. Напрыклад, увосень гаспадар не прасушыў лодку, а адразу яе згарнуў. Было нават, што да нас хтосьці прыйшоў з лодкай, дзе барты добра пагрызлі пацукі. Як казаў паштальён Печкін, «адны дзіркі»...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Самае галоўнае парушэнне — адсутнасць выратавальных камізэлек»

Сёлета з маламернымі суднамі адбылося 12 аварыйных выпадкаў. Кажучы інакш — яны перакуліліся ў вадзе разам з кіроўцам і пасажырамі пры іх наяўнасці. Загінула ж сем чалавек.

— Чамусьці не ўсе людзі ўсведамляюць, што толькі зашпіленая выратавальная камізэлька можа гарантаваць бяспеку. За час існавання Дзяржаўнай інспекцыі не было ніводнага выпадку, калі б хоць аднаго патанулага дасталі ў такой камізэльцы, — кажа Міхаіл Чашун. — Цяпер штраф за яе адсутнасць складае да трох базавых велічынь. Можа, трэба ўзмацняць адказнасць... А самае страшнае — калі нашы інспектары спыняюць судна, а там нават дзеці без выратавальных камізэлек. Была ж шэсць гадоў таму трагедыя на возеры Белым у Жыткавіцкім раёне, калі патанула адразу пяць чалавек, сярод якіх трое дзяцей.

Але менш рэзанансныя выпадкі помняцца ўжо не так. Напрыклад, у 2016 годзе дачнік папрасіў у суседа пакатацца на звычайнай драўлянай вёславай лодцы. Па двары бегалі дзеці ўладальніка плавальнага сродку. Дачнік прапанаваў пакатаць і іх. І вось лодка адышла метраў на 20 ад берага — і з-за ветрыку ў сямігадовага хлопчыка злятае бейсболка. Усе, хто знаходзіўся ў лодцы, сабраліся на адным борце, каб яе дастаць. Лодка, натуральна, перавярнуліся, і ўсе вакамгненна апынуліся ў вадзе. Хлопчык паспявае схапіцца за лодку. Дзяўчынка ж пачала тануць. Мужчына яе злавіў, але да берага даплыць не здолелі. Так іх пасля ратавальнікі і дасталі разам...

Аказаўшыся за бортам судна, трэба быць фізічна падрыхтаваным, каб залезці назад без выратавальнай камізэлькі, — гаворыць Міхаіл Чашун. — Нават трэба ведаць, як правільна ўзлазіць у лодку з вады. Рабіць гэта з борта — грубае парушэнне, таму што судна перакуліцца паўторна. Асабліва калі чалавек знаходзіцца ў нецвярозым стане. Быў у нас выпадак, калі дзяўчына з малым каталася на гідрацыкле. Нейкі мужчына сядзеў у адпаведнасці лодачцы пасярод ракі. І вось плыве гідрацыкл, а мужчына ўстаў і замахнуўся бутэлькай гарэлкі проста на кіроўцу гідрацыкла. Тая неспадзявана зрабіла рэзкі паварот. Пайшла хваля, затым удар. Так пасля вадалазы і дасталі таго мужчыну — з бутэлькай у руцэ... І зусім парадаксальная гісторыя здарылася неяк на Сожы. З аднаго берага на другі кіроўца маторнай лодкі перавозіў кампанію, якая адпачывала на беразе. Сам ён быў цвярозы. Па дарозе ўзнікла паніка. Судна перакулілася і кіроўца загінуў, паколькі ён быў без камізэлькі. Самае цікавае, што п'яныя пасажыры ўсе ўратаваліся, хоць на іх таксама ніякай страхоўкі не было. Яны проста паспелі ўчапіцца за лодку і не адпускалі яе, пакуль не падаспела дапамога.

Пераабсталяванне на свой страх і рызыку

Хто не хоча пракаціцца на маторнай лодцы па акваторыі, як той казаў, «з ветрыкам»? Праўда, на маторную лодку вялікай магутнасці патрабаванні падчас тэхагляду большыя, ды і каштуе яна значна болей за сваю больш слабую разнавіднасць. Хітрыя «вынаходнікі» пачынаюць мухляваць. Яны вымаюць стары рухавік і цішком мяняюць яго на новы. Усё б нічога, але корпус лодкі пры паскарэнні на такія нагрузкі не разлічаны. І ён ламаецца на часткі. Кіроўца і пасажыры аказваюцца ў вадзе, ну а далей усё залежыць ад таго, ці ёсць на іх тыя самыя выратавальныя камізэлькі. За такую самадзейнасць інспектары накладуць штраф да дзевяці базавых. Не кажучы ўжо пра тое, што давядзецца патрацціцца на новую лодку.

— Яшчэ ўладальнікі маламерных суднаў любяць іх цюнінгаваць. У гэтым нічога дрэннага няма, пакуль не пачынаецца самавольная змена канструкцыі судна. Напрыклад, нейкі бачок пусты. Ён выконвае функцыю астойлівасці судна. Гаспадар жа думае, што гэты бачок проста так займае месца. Адбываецца дадатковая нагрузка на борт. А ў выніку судна пераварочваецца і хутка тоне. Некалькі гадоў таму мы сутыкнуліся з гэтым на Заслаўскім вадасховішчы.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

«Для мужчын і жанчын умовы аднолькавыя»

У Мінску да Дня горада Міністэрства па надзвычайных сітуацыях падрыхтавала цікавую праграму. Каля Палаца спорту размясціліся адмысловыя зоны бяспекі. Да аўтамабіля-пярэкрута сабралася вялікая чарга. Гэты «атракцыён» меў, акрамя забаўляльнай, і навучальную функцыю. Кожны мог адчуць сябе ў сітуацыі, калі машына пераварочваецца пасля ДТЗ на дах і як добра пры гэтым быць прышпіленым рамянём бяспекі.

А крыху далей праходзілі міжнародныя спаборніцтвы «Найлепшы пажарны-ратавальнік». За званне пераможцы змагаліся 18 камандаў — 9 беларускіх і 9 замежных.

— Да нас прыехалі ратавальнікі з Бельгіі, Францыі, Чэхіі, Эстоніі, Латвіі, Германіі, Украіны, Расіі і Польшчы, — расказала **афіцыйны прадстаўнік Мінскага гарадскога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Марына ФАНДО.** — Мы, у сваю чаргу, выставілі каманды ўсіх нашых абласных упраўленняў і Мінскага гарадскога, а таксама Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння і Універсітэта грамадзянскай абароны.

Праграма спаборніцтваў складалася з двух дзён. У пятніцу ўдзельнікі праходзілі індывідуальныя забегі. У суботу ж іх чакала «Камандная эстафета», «Тандэм», калі бягуць двое мужчын, і «Тандэм-мікс», калі адначасова на дыстанцыю выходзяць і мужчына, і жанчына.

— Спаборніцтвы, па сутнасці, — гэта комплекс сілавых нагрузак на хуткасць, — патлумачыла Марына Фандо. — Па лесвіцы вежы трэба ўзняцца на вышыню чацвёртага паверха з грузам у выглядзе рукаўнай скаткі. Важыць яна 19 кілаграмаў. І гэта яшчэ не ўсё — з дапамогай троса давядзецца падняць на такую ж вышыню яшчэ адну скатку з аналагічнымі параметрамі. Потым пры дапамозе кувалды перасунуць кій вагой 73 кілаграмы на паўтара метра. І — выцягнуць манекен. Для мужчын і жанчын умовы аднолькавыя.

Крысціна Даніленка прыехала да нас з Латвіі. У Рызе дзяўчына працуе інспектарам па пажарнай бяспецы і грамадзянскай абароне. Але ў вольны час займаецца пажарна-выратавальным спортам.

— Ратавальнікам працуе мой бацька, сярод родных і знаёмых таксама шмат хто звязаў сваё жыццё з гэтай нялёгкай прафесіяй. Спорт мне падабаецца тым, што прымушае выходзіць з зоны камфорту. Але на такіх спаборніцтвах я ўпершыню. І яны даволі жорсткія. На жаль, у Латвіі чагосьці падобнага пакуль няма. Аднак сама ідэя нашай дэлегацыі спадабалася. Таму, спадзяюся, і мы неўзабаве будзем праводзіць падобны конкурс у сябе на радзіме.

Валяр'ян ШКЛЕННІК, фота аўтара.

Бяспека руху

Праміле, няўважлівасць, кювет...

Мінулыя выхадныя і пачатак тыдня былі азмрочаны чарадой здарэнняў з удзелам аўтатранспарту. На жаль, па факце ёсць пацярпелыя і загінулыя...

Так, у Кобрынскім раёне 18-гадовы п'яны бяспраўнік зладзіў ДТЗ, у якім пацярпеў падлетак. Такую інфармацыю ў сваім Telegram-канале апублікавала **прэс-сакратар МУС Вольга ЧАМАДАНАВА.** За руль мікрааўтобуса Peugeot Boxer сеў жыхар вёскі Бельск. Малады чалавек быў нецвярозы (0,6 праміле) і не меў права на кіраванне транспартным сродкам. На 13-м кіламетры дарогі Н-846 Забава — Навасёлкі — Ліпава ён не выбраў бяспечную хуткасць руху, з'ехаў у кювет, пасля чаго ўрэзаўся ў дрэвы. У выніку ДТЗ кіроўца і 15-гадовы пасажыр мікрааўтобуса атрымалі траўмы. Маладыя людзі былі шпіталізаваны ў Кобрынскую райбальніцу.

«За выхадныя супрацоўнікі ДАІ па краіне выявілі больш за 150 кіроўцаў, якія селі за руль у стане алкагольнага ап'янення. МУС у гэтым пытанні паслядоўна выступае за ўзмацненне жорсткасці пакарання нецвярозых кіроўцаў і павелічэнне штрафаў у залежнасці ад ступені алкагольнага ап'янення», — падкрэсліла Вольга Чамаданава.

У Слуцкім раёне кіроўца легкавога аўтамабіля пры абгоне не справіўся з кіраваннем, машына вылецела ў кювет. Аварыя здарылася ўдзень на 118-м кіламетры аўтадарогі Р23. Як папярэдне мяркуецца, кіроўца Citroen хацеў па ўзбочыне абагнаць аўтамабіль Toyota. Машыну занесла, яна па датычнай зачапіла «японца», выехала на паласу сустрэчнага руху і, некалькі разоў перакуліўшыся, вылецела ў кювет. Кіроўца загінуў.

Ужо ў панядзелак ранкам у Мінску на падземным паркінгу загарэўся Mercedes. Агонь патушылі члены добраахвотнай пажарнай дружыны, паведамілі ў Мінскім гарадскім упраўленні МНС. Ратавальнікам паступіла паведамленне аб узгаранні легкавога аўтамабіля на падземным паркінгу гандлёвага цэнтра па вуліцы Дзянісаўскай. Гаспадыня машыны прыехала на работу і пакінула аўто на падземнай стаянцы. Праз 20 хвілін у ГЦ спрацавала пажарная сігналізацыя. Работнікі МНС прыбылі праз лічаныя хвіліны пасля паведамлення пра здарэнне. Аднак да гэтага часу члены добраахвотнай пажарнай дружыны гандлёвага цэнтра самастойна справіліся з узгараннем пры дапамозе парашковых вогнетушыцеляў. Агнём пашкоджаны маторны адсек легкавога аўтамабіля Mercedes-Benz E270. Ніхто не пацярпеў. Прычына ўзгарання высвятляецца, разгляданая версія — кароткае замыканне электраправодкі ў маторным адсеку.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Наш чалавек!

«ПЕРАЖЫЦЬ І АДОЛЕЦЬ МОЖНА ЎСЁ...»

Гэту жанчыну ў Глуску ведаюць многія. Нехта — як былую работніцу санаторнай школы-інтэрната, нехта — як ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, нехта — як проста сціплага светлага чалавека, якога не зламалі ніякія жыццёвыя віхуры.

Шчаслівага дзяцінства ў Валянціны Васілеўны Зайцавай (у дзявоцтве — Чаропка), можна сказаць, не было. У чатыры гадкі засталася без бацькі, праз год не стала матулі. Валю і яе малодшую сястру гадавалі амаль сляпая цётка і суседзі. Апрануць сіротам не было чаго, абуць таксама. Змалку дзяўчынка навучылася плесці лапці, дапамагаць па гаспадарцы цётцы, суседзям і пастухам у якасці падпаска.

Паварот да лепшага яе жыццё зрабіла толькі тады, калі трапіла ў дзіцячы дом, які адкрыўся ў вёсцы Веснава. Там малую адзелі і абулі, там уволю кармілі. Не дзіва, што ўдзячная дзяўчынка расла актыўнай і стараннай да вучобы, што яе як найлепшую выхаванку дзіцячага дома накіравалі на адпачынак у Нарачанскі піянерскі лагер (сёння — «Зубраня»). І было гэта ў чэрвені 1941-га...

Доўгай, поўнай трывог і страху была для дзяцей дарога з Беларусі ў Падмаскоўе, затым у Мардовію, на Урал — у горад Залатавуст. Тут Валянціна ўжо стала працаваць на адным з ваенных заводаў, была камсоргам змены, аж пакуль на прадпрыемстве не з'явіліся работнікі ваенкамата і не спыталіся, ці не хоча хто-небудзь пайсці вучыцца ў Омскае інтэнданцкае ваеннае вучылішча.

Хто, як не камсорг, павінен быў падаць прыклад іншым — выступіць наперад...

Тое ж услед за Валянцінай зрабілі яшчэ некалькі дзяўчат.

Майстар змены, пачуўшы пра гэта, толькі пасмяяўся: якое, маўляў, вучылішча? Па-першае, у нас бронь, а па-другое (на адрас Валі), «ты і гадамі яшчэ не выйшла».

Тым не менш праз тры дні дзяўчына атрымала позву ў ваенкамат — з рэчамі...

У вучылішчы, як згадвала, было вельмі цяжка: вучылі акопвацца, страляць з розных відаў зброі і нават (калі пагражае палон) у... сябе. Аднак, дзякаваць богу, гэтая доля яе абмінула: пасля вучобы Валянціну размеркавалі ў танкавую часць старшым кухарам. І хоць работа гэта з ліку малапрыкметных, дзяўчына была там, дзе ішлі баі, дзе вырашаўся лёс перамогі. А гэта — бітва за Маскву, наступленне, першыя гарады, якія ўдалося вызваліць ад ворага, Курская дуга... На ёй, як здавалася Валянціне, сутыкнуліся само жыццё і смерць. Перамагло першае, але ж і смерць забрала з сабой нямала яе сяброў-франтавікоў. Валянціна таксама трапіла ў шпіталь з кантузіяй.

А вайна коцілася ўсё далей на захад, і разам з ёй крочыла ўжо старшына Валянціна Чаропка, на гімнасцёрцы ў якой быў медаль «За баявыя заслугі». І гэта ўжо не за парадак на салдацкай кухні, а за нясенне дарожна-патрульнай службы, умелыя дзеянні на кантрольна-прапускных пастах, дзе яе каманды выконвалі ўсе. Сведчаннем таму адзін эпізод.

Аднойчы каля Варонежа яна рэгулявала пераправу кавалерыйскіх часцей цераз невялікую рэчку. Адолець гэту водную перашкоду трэ было як мага аператыўней, пакуль не наляцеў нямецкі самалёт-разведчык. Валянціна дзейнічала хутка і дакладна: усё ішло як мае быць, пакуль у шэрагі коннікаў не ўклінілася нейкая легкавушка. Спецпропуска на лабавым шкле ў яе не было. «Стой!.. Стой!» — закрычала дзяўчына, выпусціўшы ў паветра папераджальную аўтаматную чаргу... «Галасістая ты, — сказаў ёй потым маршал Будзённы, які ехаў у машыне. — Табе б кавалерыйскім палком камандаваць... Малайчына, добра службу нясеш. Трымай падарунак». Маршал зняў з рукі свой гадзіннік і ўручыў збянтэжанай дзяўчыне. А крыху пазней прыйшла яшчэ адна ўзнагарода — медаль «За адвагу».

...Перамогу старшына Валянціна Чаропка сустрэла ў Германіі, недалёка ад Берліна. Адтуль яе накіравалі ў Беларусь у горад Асіповічы, але ж дзяўчыну цягнула дамоў, туды, дзе ўсё было знаёма і вядома, — у свой Глускі дзіцячы дом. Тут некалі яе сагравалі чулыя сэрцы людзей, а цяпер ужо яна, Валянціна Васілеўна, старалася адагрэць сваёй дабрынёй і клопатам іншых сірот, чые бацькі загінулі ў гады вайны...

Выйшла замуж, нарадзіла чацвярых дзяцей, гадавала ўнукаў і праўнукаў. Такім чынам, усё жыццё, можна сказаць, займалася выхаваннем: працавала піянерважатай, лабаранткай і бібліятэкарам у Глускай санаторнай школе-інтэрнаце, адкуль і пайшла на пенсію.

...Мінулае, вядома ж, не забываецца. І хоць гэтыя ўспаміны для жанчыны і цяжкія, і горкія, яна іх не гоніць. Кажа, што ўсё можна перажыць і адолець, толькі б над галавой не свісталі кулі.

Валерый Васілеўскі.
г. п. Глуск.

Уражанні

«АЎЦЮК, ДЫК ЁН І Ў АФРЫЦЫ АЎЦЮК...»



— Курыш?
— Не!
— Выпіць любіш?
— Не!
— Ну а жанчын?...
— Таксама не.
— А што ж ты любіш?
— Брахаць люблю!

(З аўцюкоўскага гумару).

У нашай краіне розных свят ды фестываляў, згадзіцеся, шмат, аднак вось гэты — народнага гумару — бадай самы ўнікальны. Прыемна, што сёлета ён зноў сабраў цэлыя плошчы людзей і поўныя куфры анекдотаў, жартаў, прыпевак. Гумарысты з усёй Беларусі і нават з-за межаў з'ехаліся ў гэтыя вёсачкі (хто не ведае, іх дзве: Вялікія Аўцюкі і Малыя, прычым першыя насамрэч меншыя...), каб расказаць смешнае, каб пачуць мудрае, каб пабываць у карчме «Ганарысты парсюк» і прыкупіць сабе добрых эмоцый (а яны, згадзіцеся, дарагога каштуюць), наведаць музей народнага гумару... Уразіў і адкрыты на сёлетнім фестывалі ўнікальны аб'ект — «Аўцюкоўскі глобус». Многім — прычым з аўкцыёну — пашчасціла купіць там зямлі для будаўніцтва сваіх гарадоў з уласнымі назвамі.

Нельга забываць, што чалавек, які ўмее жартаваць, — умее і прыгожа жыць. Павучыцца гэтаму можна ў мудрых палешукоў, у тых самых аўцюкоўцаў. Адкрыў іх таленавіты пісьменнік Уладзімір Ліпскі, і адкрыў, упэўнены, назаўжды: радзіма Каласкоў і Калінак (так у ваколіцах называюць мужчын і жанчын) будзе і надалей радаваць людзей, прыцягваць сюды гумарыстаў і шматлікіх гасцей, бо, як вядома,

Аўцюк, дык ён і ў Афрыцы аўцюк,
І так ужо з глыбінь вякоў вядзецца,
Ён скажа: — Сёння з больніцы я ўцюк, —
І будзе памяраць ды засмяецца!

Канстанцін Карнялюк. *г. Віцебск.*

КАБ У ВОКНАХ НЕ ПАТУХЛА СВЯТЛО

У дзіцячы сад-школу аграгарадка Васільеўка, што ў Добрушскім раёне, сёлета прыйшлі толькі... тры першакласнікі. Аднак настаўнікі добра падрыхтаваліся да новага навучальнага года: зрабілі рамонт у класах, навялі прыгажосць у памяшканнях для малечы.

Падобны клопат, вядома ж, толькі радуе ды мацуе надзею, што з трыццаці вучняў нехта застанецца ў родных мясцінах, што тут будуць працаваць і школа, і клуб, і сельская бібліятэка, што не патухне святло ў вокнах вяскоўцаў.

Гэтай думкі трымаецца **і бібліятэкар Алена Іванаўна ДЗЕРГАЧОВА.** Паказаўшы на сваіх юных ды маладых чытачоў, яна даверліва прамовіла:

— Гэтыя хлопцы — мае першыя памочнікі. Валодзя Васькаўцоў, Павел Дзергачоў, Аляксей Балаболаў, Ігар Дубаўцоў навялі парадак каля помнікаў чырвонаармейцам, дапамагаюць бацькам па гаспадарцы, актыўна трэніруюцца ў спартыўнай зале, якую, дарэчы, зрабілі самі.

З размовы высветлілася, што мясцовы фермер Ігар Савельевіч Балаболаў у свой час выкупіў будынак былой сталовай, але задуму сваю да канца не давёў — не паспеў, таму ўдава яго Кацярына Мікалаеўна, кіраўнік тутэйшай фермерскай гаспадаркі па магчымасці дапамагае мясцовай моладзі. У маі на школьным стадыёне хлопцы арганізавалі спартыўныя спаборніцтвы, у якіх бралі ўдзел і дарослыя вяскоўцы. Закуплена абсталяванне і для прапаганды здаровага ладу жыцця. А ўсталяваць яго Уладзіміру Васькаўцову дапаглі ўсё тыя ж Аляксей Балаболаў, Павел Дзергачоў, Ігар Дубаўцоў ды іншыя. Цяпер яны мараць знайсці фундатара, які дапамог бы прывесці ў належны стан спартыўную залу і раздзявальню...

Можа, прачытаўшы гэтыя радкі, нехта адгукнецца?

Ганна АТРОШЧАНКА. Фота аўтара.

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

ЗАО «ЕВРОБАНК» ИЗВЕЩАЕТ

о проведении шестых повторных торгов в электронной форме в виде открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ликвидируемому закрытому акционерному обществу «Евробанк» (далее – электронные торги).

Продавец – ЗАО «Евробанк».

Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке «Единая система электронных торгов» — torgi.gov.by.

Продолжительность электронных торгов – 30 календарных дней (с 20.09.2019 г. по 19.10.2019 г.)

Сведения об имуществе, выставляемом на электронные торги:

№ лота	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС	Шаг торгов (5 %), бел. руб.	Сумма задатка (5 %), бел. руб.	Преимущества
Лот № 1	Капитальное строение с инв. № 500/С-35055, общая площадь 1432 кв. м, 4-й этаж, расположенное на земельном участке площадью 0,1235 га с кад. ном. 500000000007006447, который находится на праве аренды по 31.01.2023 г., по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева. 129/5	1 174 706,04	58 735,30	58 735,30	- пригодно для размещения банков и финансовых организаций; - установлены дополнительные системы защиты от взлома; - внутренняя и внешняя отделка здания; - имеются все инженерные коммуникации; - система кондиционирования; - оборудованы офисные помещения; - расположено в торговом комплексе «Ждановичи»; - отличное транспортное сообщение; - 630 м от МКАД; - охраняемая территория с видеонаблюдением; - парковочные места на территории
Лот № 2	Сеть волоконно-оптических кабелей (волоконно-оптический кабель на объекте ТРЦ «Град» и волоконно-оптическая линия на участке: помещение АТС (г. Минск, ул. Тимирязева, 125/8) – серверная РКЦ-2 (г. Минск, ул. Тимирязева 123/4)	8 760,00	438,00	438,00	- высокая скорость передачи информации (от 1 до 10 Гбит/с на расстоянии 1 км); - небольшие габаритные размеры и масса кабелей; - высокая помехозащищенность волоконно-оптических кабелей

Подробную информацию о реализуемом имуществе ЗАО «Евробанк», включая фотографии, можно получить на сайте: *http://www.torgi.gov.by*

Также с имуществом, выставляемым на электронные торги, можно ознакомиться по месту его нахождения, предварительно согласовав время по тел. +37529 141 01 01 (ликвидатор — ЗАО «Евробанк» Хвостович Сергей Валерьевич).

Для участия в электронных торгах по Лотам №№ 1—2 в период с 20 сентября 2019 года по 19 октября 2019 года необходимо **зарегистрироваться на электронной торговой площадке «Единая система электронных торгов» — torgi.gov.by и сделать ставку** (при условии наличия на счете участника торгов, открытом на электронной площадке, достаточной суммы средств для внесения задатка) в размере 10 % от начальной цены имущества. Сумма шага аукциона по каждому лоту составляет 5 % от начальной цены предмета аукциона.

Электронные торги проводятся в соответствии с постановлением Советом Министров от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица».

Победителем электронных торгов является лицо, предложившее наибольшую цену.

Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов производятся победителем электронных торгов по фактическим затратам.

В случае если электронные торги признаны несостоявшимися, в силу того что ставка сделана только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 %.

По результатам электронных торгов составляет протокол в двух экземплярах. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней с даты проведения электронных торгов.

Срок оплаты предмета торгов — 30 календарных дней со дня заключения договора купли-продажи.

Подробную информацию о порядке, условиях проведения электронных торгов, предмете торгов можно получить по тел. +37529 308 38 37 (Алена Александровна)

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества Автотранспортного унитарного предприятия «Забудова-Автотранс»

Таблица № 1

Лот	Наименование	Местонахождение	Сведения о земельном участке	Начальная цена с НДС, бел. руб.
1	Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-62355, площадь 0,0 кв. м, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ, наименование – склад нефтепродуктов	Минская обл., Молодечненский р-н, Чистинский с/с, п. Чисть, ул. Заводская, 1	Земельный участок площадью 0,2623 га с кадастровым номером 623886007601000532. Назначение – земельный участок для содержания и обслуживания склада нефтепродуктов, расположенный по адресу: Минская область, Чистинский с/с, п. Чисть, ул. Заводская, д. 1. Назначение – земельный участок для содержания и обслуживания склада нефтепродуктов. Предоставлен на праве постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь	125 601,84

В отношении имущества, указанного в таблице № 1, проводятся третьи повторные торги. Цена снижена на 10 %. Публикация об аукционе была размещена в газете «Звязда» от 03.09.2019

Таблица № 2

Список лотов, входящих в таблицу № 2, доступен по ссылке: https://yadi.sk/d/dDe_7-cMQcHezg

Таблица № 3

Список лотов, входящих в таблицу № 3, доступен по ссылке: https://yadi.sk/d/73UBueulHJTL7w

Таблица № 4

Список лотов, входящих в таблицу № 4, доступен по ссылке: https://yadi.sk/d/3GkKh-mHalmVCA

В отношении имущества, указанного в таблицах №№ 2—4, проводятся вторые повторные торги. Цена снижена на 20 %. Публикация об аукционе была размещена в газете «Звязда» от 03.09.2019

Дата и время проведения торгов	**30 сентября 2019 года в 13.00 (регистрация с 12.30 до 12.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф.1121
Окончание приема заявлений	26 сентября 2019 года в 16.00
Шаг аукциона	5 % от начальной стоимости лота
Задаток	10 % от начальной стоимости лота
Информация о продавце	Автотранспортное унитарное предприятие «Забудова-Автотранс» (Минская обл., Молодечненский р-н, п. Чисть, ул. Заводская, 4, УНП 600468334). (Ликвидатор – ООО «ФИБЛ»)
Условия для участия в торгах	1. Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah. 2. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с BY36ALFA30122215570040270000, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту № __ , проводимых __.__.2019. 3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121. 4. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 10 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона и возмещения победителем затрат по организации и проведению торгов в размере 5 % от начальной стоимости объекта торгов, а также затрат по размещению публикации (согласно выставленному счету). Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 5 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи. 5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона. 6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов – Борис Юрьевич +375 29 326-16-12. 7. Организация и проведение аукциона осуществляются на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16. 8. Расходы, связанные с регистрацией, транспортировкой и ремонтом имущества возлагаются на Победителя аукциона

Организатор аукциона – ООО «Фрондера»: 8 (029) 304-25-60, e-mail: frondera@mail.ru

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

сообщает о проведении 02.10.2019 повторного открытого аукциона (цена снижена на 20 %)

Лот № 1: капитальное строение с инвентарным номером 710/С-57497 — административное здание, площадь 378,2 кв. м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-57496 — склад**, площадь 29,0 кв. м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-57495 — производственное здание**, площадь 569,4 кв. м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78912 — тепловые сети,** протяженность – 63,9 м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78914 — канализационная насосная станция**, площадь – 1 кв. м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78913 — водопровод**, протяженность – 105,7 м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78911 — канализационная сеть**, протяженность – 87,2 м. **Капитальное строение с инвентарным номером 710/С-78915 — благоустройство территории**, площадь – 2117,9 кв. м. Лот № 1 расположен по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Западная, 9А. Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 741000000003000383, площадь — 0,5155 га, расположен по адресу: г. Бобруйск, ул. Западная, 9А. **Обременения на объекты продажи:** арест (будет снят в случае продажи).

Начальная цена продажи: 481 544,36 бел. руб. с учетом НДС. Сумма задатка: 48 154,44 бел. руб.

Аукцион состоится 2 октября 2019 года в 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок и внесение задатка: по 01.10.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для перечисления задатка: получатель платежа — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Продавец: ОАО «Строительный трест № 12» Управляющая компания Холдинга «СТРОЙТРЕСТ-ХОЛДИНГ», УНП 700200537, г. Могилев, ул. Буденного, 11

Срок и условия оплаты: победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона, включающее в т. ч. затраты на организацию и проведение аукциона, в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 15 (пятнадцать) календарных дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 06.07.19

Организатор аукциона: **Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»** УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by. Дополнительную информацию можно получить по тел.: **+375222 72-41-14, +37529 624-26-25, сайт — ino.by**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «СМТ № 8», г. Минск, ул. Пионерская, 37

Предмет аукциона

Лот № 1

Месторасположение**: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Добрушская, 91А и 91Д**

Производственная база в составе: **склад РМХ-20** (350/С-174808, 193,5 кв. м), **здание материального склада № 2** (350/С-56797, 478,6 кв. м), **здание административно-бытовое** (350/С-56799, 550,5 кв. м), **гараж** (350/С-56788, 675 кв. м), **склад по обогреву инертных материалов** (350/С-56798, 29,6 кв. м), **склад масел** (350/С-56822, 23,5 кв. м), **здание материального склада № 1** (350/С-56796, 1072,5 кв. м), **склад цемента** (350/С-56819, 33 кв. м), **проходная** (350/С-56823, 14,8 кв. м), **компрессорная** (350/С-56820, 62,6 кв. м), **котельная** (350/С-56800, 110 кв. м), **ограждение и бетонная площадка производственной базы** (350/С-204615, составные части и принадлежности: ограждения — ж/б — 468,1 кв. м, 316,0 кв. м, 1214,5 кв. м, из металлической сетки — 11,5 кв. м, деревянное — 17,1 кв. м, металлическое — 4,8 кв. м, кирпичное — 4,3 кв. м; ворота, калитка, площадка бетонная, покрытия).

Сведения о земельном участке: предоставлены на праве постоянного пользования пл. **4,4874** га для эксплуатации и обслуживания административных и производственно-складских помещений производственной базы и пл. **0,5576** га для эксплуатации и обслуживания зданий специализированных складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ. Обременения прав на зем. уч. 0,5576 га — охранные зоны линий связи и радиофикации, электрических сетей, сетей и сооружений водоснабжения и канализации

Обременения: площади здания материального склада № 2, бетонная площадка, склад масел, часть помещений гаража и здания материального склада №1 сданы в аренду. Более подробную информацию можно узнать у организатора аукциона

Начальная цена лота №1 с НДС 20 % – 207 909,72 бел. руб. (снижена на 10 %)

Лот № 2

Месторасположение**: г. Минск, ул. Кальварийская, д. 37, корп. 1, пом. 2**

Административное помещение (653,9 кв. м, 500/D-681880)

Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 1 254 449,57 бел. руб. (снижена на 20 %)

Задаток (по лоту № 1 – 10 %, по лоту № 2 — 1 % от начальной цены предмета аукциона) перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Извещения о проведении предыдущих аукционов опубликованы в г. «Звязда»: по лоту № 1 — 30.07.2019, по лоту № 2 — 16.08.2019

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона: 01.10.2019 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 30.09.2019 до 17.00** по указанному адресу. **Тел: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

ВНИМАНИЮ ПРЕДПРИЯТИЙ, ОРГАНИЗАЦИИ И ИНДИВИДУАЛЬНЫХ ПРЕДПРИНИМАТЕЛЕЙ!

Фондом «Гроднооблимущество» проводится аукцион по продаже неиспользуемого имущества, находящегося в собственности Волковысского района.

К продаже предлагается:

1. Капитальное строение: здание поликлиники с принадлежностями в Волковысском районе по адресу: г. п. Красносельский, ул. Победы, 38.

Аукцион состоится: **10 октября 2019 г. в 11.30.**

Заявки на участие в аукционах принимаются по адресу: город Гродно, улица 17 Сентября, 39.

Последний день подачи заявлений на участие в аукционах – **4 октября 2019 г. до 17.00.**

Подробная информация размещена на сайте http://www.region.by, http://www.gki.gov.by.

Справки по телефонам:
в городе Волковыске – (801512) 4 50 25;
в городе Гродно – (80152) 772915, 722518, 72 21 02

УНП 500007288

«Антикризисный управляющий ООО «МАГНУС групп» — ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов)

извещает о проведении 21.10.2019 г. открытых торгов по продаже имущества ООО «МАГНУС групп» по начальной стоимости:

модульный городок из 2 сблокиров. блоков (12 модулей с 2 коридор. модулями) с доп. комплектацией в размере 11 928,00 р.,

модульный городок из 2 сблокиров. блоков (8 модулей с 2 коридор. модулями)с доп. комплектацией в размере 7 951,29 р.,

модульный городок из 2 сблокиров. блоков (16 модулей с 2 коридор. модулями) с доп.комплектацией в размере 15 903,29 р.,

модульный городок из 2 сблокиров. блоков (10 модулей с 2 коридор. модулями) в размере 6 778,89 р.

С условиями проведения торгов и условиями участия в торгах можно ознакомится на сайте интернет портала Единого государственного реестра сведений о банкротстве: bankrot.gov.by (Должник: ООО «МАГНУС групп»; вкладка: «Реализация имущества»)»

УНП 191112191

Закрытое акционерное общество «ЮНИМИТ»

(222220, Республика Беларусь, Минская обл., Смолевичский район, Плисский сельсовет, 9/12 в районе поселка Октябрьский)

сообщает, что директором ЗАО «ЮНИМИТ» 16.09.2019 принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг. Формирование реестра акционеров осуществляется на 16.09.2019.

УНП 690660279.

ТАТА — МОЖА!

Мужчыны — пра сваё жыццё ў дэкрэце

На сямейным фестывалі «ТатаPro» таты, якія вырашылі пайсці ў дэкрэтны адпачынак або раздзяліць яго з жонкай, падзяліліся сваімі гісторыямі і расказалі пра тонкасці дэкрэта.

Таты ў дэкрэце дзеляцца сваім вопытам.

Яўген КАРНЕЯВЕЦ (29 гадоў):

— Я пайшоў у дэкрэт не з першых дзён нараджэння дзіцяці — мы з жонкай памяняліся ролямі дзесьці на сярэдзіне. Я ўдзельнічаў у выхаванні дачкі з самага першага дня, прывык да гэтага і падумаў: чаму б і не? Тым больш што мне ў гэты час прапанавалі працаваць дыстанцыйна па дагаворы падраду, вось я і вырашыў: у грошах я нічога не страчу, можна паспрабаваць.

Скажу адразу: гэта зусім не так, як пабыць з дзіцем адзін-два дні выхадных, а значна складаней. Гэта цяжка нават чыста псіхалагічна, бо свой дзень зусім немагчыма распланаваць: дзіця зараз хоча гуляць, а праз хвілін ну ўсё можа змяніцца... Ты цэлы дзень на нагах і вельмі стамляешся пад вечар.

Была і такая складанасць: ні аддзел кадраў на маёй рабоце, ні бухгалтэрыя, ні нават мясцовы ФСАН не ведалі дакладна, як афарміць мой дэкрэтны водпуск, таму што сутыкнуліся з такой сітуацыяй упершыню. Яшчэ аказалася, што жанчынам, якія працуюць па дагаворы падраду падчас дэкрэтнага водпуску, плацяць 50 % дэкрэтных грошай у тыя дні, калі яны працуюць па гэтым дагаворы. Але мне за гэтыя дні не плацілі нічога. Праўда, потым аказалася, што пункт, які рэгламентуе гэта, можна трактаваць дваяка. Але давялося за гэта пазмагацца.

Хачу перасцерагчы: думаю, у кожнага бацькі, які абраў дэкрэтны адпачынак, аднойчы можа надысці момант, калі ён адчувае, што не спраўляецца. Гэта можа адбыцца, калі дзіця ў істэрыцы амаль цэлы дзень або захварэла — і тады ў мужчыны могуць здаць нервы. У кожнага гэта будзе, у кожнага гэта было... Тут трэба неяк спыніць сябе, сабрацца з думкамі, ну хоць выйсці падыхаць на балкон... Таму любому бацьку не перашкодзіць моцнае самавалоданне — часам патрэбныя сапраўды жалезныя нервы, каб справіцца з такімі сітуацыямі.

Некаторыя кажуць, што жыццё ў дэкрэце нагадвае дзень сурка — адно і тое ж кожны дзень, каша ў адзін і той жа час... Але на самай справе дні ляцяць вельмі хутка. Дзіця расце, мяняецца, і кожны дзень яно іншае. А самае галоўнае — ты на свае вочы бачыш, як яно развіваецца! Сапраўды, часта пад канец дня стомленасць і стрэс такія, што ты проста падаеш без сіл. Але калі дачка падыходзіць і абдымае цябе — гэта такая радасць, што ты проста імгненна ўсё забываеш і стомленасць праходзіць.

Руслан ПІСАРЭНКА (37 гадоў):

— Спачатку было складана. Ёсць такое меркаванне, што калі ты сядзіш дома, то як быццам нічога не робіш. Дык вось — вельмі шмат чаго робіш! У мяне трое дзяцей. І я прачынаюся тады, калі прачынаецца малодшае дзіця, — гэта можа быць і ў шэсць раніцы, таму што яму жывоцік баліць, скажам. А скончыцца дзень можа ў дзве гадзіны ночы, пасля таго як ты скончыў уборку. Дзень пралятае ў імгненне вока, і часам нават прысесці немагчыма. Здаецца, нічога не робіш, але калі вечарам пачынаеш усё ўспамінаць, то высвятляецца, што на самай справе перароблена куча спраў: мы схадзілі ў паліклініку, паправілі ровар, зрабілі машынку, пагулялі на вуліцы... Аказваецца, нядрэнна папрацавалі!

Я цяпер у поўнай меры разумею жанчыну, якая корміць грудзьмі і прачынаецца па патрабаванні дзіцяці, якое захацела есці, а потым тут жа засынае. Я сам праз паўгода мог прачнуцца, закалыхаць дзіця, потым імгненна заснуць, прачнуцца зноў праз паўтары-дзве гадзіны, каб зноў яго закалыхаць або памяняць падгузнік, і зноў заснуць... Неяк жонка запісала аўдыё таго, як я калыхаю дзіця і спяваю яму песеньку. Гэта была самая сапраўдная палынь свядомасці! Я гэтага нічога не памятаў і дужа здзівіўся, што я мог такое спяваць. Але цяпер майму малодшаму ўжо амаль два гады, і я ўжо сплю як усе нармальныя людзі.

Я медыцынскі псіхолаг па адукацыі і хачу даць параду. У таты ў дэкрэце ў складанай сітуацыі, калі яго дзіця хварэе альбо крычыць у істэрыцы, у галаве павінна быць адна думка: ты — дарослы чалавек. І гэта ты павінен спраўляцца з дадзенай сітуацыяй, а не тваё дзіця. Ты павінен заўсёды разумець, што перад табой маленькі чалавечак. Ён не мае таго вопыту, які ўжо ёсць у цябе. Дзеці шмат чаго не ведаюць. Яны нават не ведаюць, што такое злосць, лютасць, крыўда, калі вы ім гэтага не патлумачылі. Дзіця не можа словамі вам расказаць: слухай, тата, я на цябе пакрыўджаны, ты мяне разбудзіў а шостай раніцы і некуды вядзеш, у дзіцячы сад ці яшчэ кудысьці, ты чагосьці ад мяне хочаш, а я не хачу, я хачу спаць... Яно не можа, як дарослы, табе ўсё гэта сказаць і кажа як можа — сваімі капрызамі, істэрыкай... Таму дзіця трэба вучыць гаварыць пра тое, што яно адчувае. Напрыклад: «табе крыўдна, што на цябе насварылася бабуля», альбо — «гэта лімон, таму ў цябе кісла ў роце»...

Кірыл БУДКЕВІЧ, заснавальнік сацыяльна-асветніцкай установы «Сямейны цэнтр «Тата можа», шчаслівы бацька траіх дзяцей (38 гадоў):

Пасля нараджэння сына мая афіцыйная работа і бізнес, якім я займаўся, адышлі на другі план. Я стаў вывучаць спецыяльную літаратуру на дзіцячую тэматыку, паступіў у інстытут на педагога-псіхолага, у маім асяроддзі з'явіліся мамы і таты...

Я стараюся даваць сваім дзецям мінімум абмежаванняў. Перш чым забараніць дзіцяці што-небудзь, я заўсёды імкнуся зразумець, чым былі выкліканы яго паводзіны ці просьба.

Напрыклад, сын Алешка па раніцах прачынаўся раней за ўсіх, спаўзаў з ложка і цягнуў мяне сонная за руку ў вялікі пакой. Я не тлумачыў яму, што мне не хочацца ісці, бо разумеў, што яму там аднаму сумна, таму я проста ўставаў і ішоў за ім. Гэтая гатоўнасць ісці насустрач дапамагае наладзіць псіхалагічны кантакт і давер паміж намі. Жаданні дзіцяці могуць змяняцца вельмі хутка, і гэта нармальна, проста пра гэта трэба ўвесь час памятаць і не злавацца на малога. У адну секунду яно можа перадумаць або захацець чагосьці яшчэ. Я стараюся даць дзіцяці максімальную свабоду. Напрыклад, у нас у кватэры можна маляваць на шпалерах, гуляць у футбол, пакінуць недаедзенай страву ў абед...

У нашым сямейным цэнтры мы прапагандуем думку, што тата можа актыўна ўдзельнічаць у жыцці сям'і. Напрыклад, мы праводзім спецыяльныя майстар-класы. А для тых татаў, хто абраў дэкрэтны адпачынак і адчуў, што не спраўляецца, у нас маецца група «Тата можа».

Хачу сказаць: гэта выдатна — бачыць, як тваё дзіця расце, развіваецца. Ты пачынаеш нават ганарыцца сабой у такія моманты. Лічу: гэта вопыт, які павінен быць у кожнага мужчыны. Любы мужчына павінен паспрабаваць хоць месяцы два-тры пабыць са сваім дзіцем сам-насам.

Святлана БУСЬКО, фота аўтара.

14 верасня ў сталіцы прайшоў сямейны фестываль «ТатаPro» — мерапрыемства ў новым для нашай краіны фармаце open-класаў: адкрытыя зносіны і майстар-класы і лекцыі ад экспертаў. На ім сабраліся найлепшыя спецыялісты сферы мацярынства і дзяцінства, брэнд-эксперты, каб у простых пытаннях і адказах растлумачыць усё тое, пра што хочуць ведаць сучасныя бацькі. Вёў імпрэзу вядомы малады тата і спявак Тэа, а на пляцоўках знаходзіліся дзясяткі памочнікаў: малых дапамагалі глядзець прафесійныя псіхолагі, таксама любы ахвотны мог згуляць партыю вялікімі роставымі фігурамі з юнымі шахматыстамі Беларускай федэрацыі шахмат. Мерапрыемства прайшло пры падтрымцы Міністэрства аховы здароўя Беларусі і Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

Гавораць спецыялісты...

На сямейным фестывалі «ТатаPro» спецыялісты са сферы мацярынства і дзяцінства расказалі пра мужчынскае здароўе, партнёрскія роды і тое, якія правы ёсць у татаў.

Галоўны пазаштатны акушэр-гінеколаг Міністэрства аховы здароўя Святлана НАГІБОВІЧ:

— Займаючыся аналізам прычын бясплоднасці сямейных пар, мы гадоў пяць таму (а ў свеце наогул яшчэ раней) прыйшлі да высновы, што цяпер асноўнай прычынай гэтага з'яўляецца мужчына. Таму ў нашай краіне цяпер адкрываюцца цэнтры планавання сям'і, у якіх мяркуецца абавязковае адкрыццё кабінетаў мужчынскага здароўя, дзе працуюць уролагі або андролагі. І мы спадзяёмся, што нашы мужчыны пойдуць туды.

Намеснік галоўнага ўрача па акушэрска-гінекалагічнай дапамозе 5-й гарадской клінічнай бальніцы Мінска Марына ШКРОБ:

— Сёлета ў нас ужо прынята больш за тры тысячы родаў, пры гэтым каля 20 % з іх — партнёрскія, то-бок з удзелам таты. Гэта кожныя 5-я роды! І з кожным годам іх колькасць робіцца ўсё большай.

Ці патрэбна спецыяльная падрыхтоўка, каб удзельнічаць у партнёрскіх родах? Безумоўна, так. Справа ў тым, што партнёр у родах — гэта не глядач і не слухач, а памочнік. Таму ён павінен уяўляць, што адбываецца з жанчынай, калі яна нараджае, і як можна палегчыць яе стан. Цяпер курсы падрыхтоўкі да родаў існуюць практычна пры ўсіх сталічных радзільных дамах, ёсць і шэраг камерцыйных курсаў.

Намеснік старшыні камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама Ірына ДУДКА:

— Для шматдзетных сем'яў у нас існуе развітая сістэма падтрымкі, і мы ўсё больш пачынаем падтрымліваць не толькі мам, але і татаў. Яны цяпер цалкам зраўняныя ў правах з мамамі. Сціраецца стэрэатып, што тата ў сям'і — здабытчык, а мама — захавальніца сямейнага ачага. Сёння мы кажам пра роўныя правы і роўны ўдзел абодвух бацькоў у выхаванні дзяцей.

Штогод у трэція выхадныя чэрвеня ўжо традыцыйна ў Мінску адзначаецца дзень бацькі. Таксама на сённяшні дзень нашым заканадаўствам прадугледжана права бацькі пайсці ў дэкрэтны водпуск.

На ўзроўні заканадаўства ўжо ўнесены змены ў Працоўны кодэкс, і з 28 студзеня 2020 года ўступіць у сілу такая новая льгота для татаў, як прадстаўленне сацыяльнага водпуску для таты працягласцю не менш за 14 дзён на працягу 6 месяцаў з дня нараджэння дзіцяці. Гэты водпуск неаплатны, але мы сумесна з прафсаюзамі рэкамендуем, каб у калектыўныя дамовы на прадпрыемствах уносіўся пункт аб аплаце гэтых 14 дзён, а таксама каб такі водпуск быў большы за прадугледжаныя абавязковыя два тыдні. Акрамя таго, сёння ў нас ужо ёсць арганізацыі, хай і адзінкавыя, дзе проста пры вытворчасці ці офісе адкрываюцца дзіцячыя сады і яслі...

Святлана БУСЬКО.

КАРОБКІ ДЛЯ НЕМАЎЛЯТ

Усім дзецям, якія сёлета з'явяцца на свет у сталічных радзільных дамах, будуць уручаць падарункі

У каробках, падрыхтаваных арганізатарамі праекта «МамаPro», будзе ўсё самае неабходнае для першых дзён жыцця немаўляці і маладых бацькоў — падгузкі, цацкі, сродкі гігіены — дзясяткі прадметаў. Першымі падарункі атрымаюць тыя малыя, якія народзяцца ў Дзень маці, 14 кастрычніка, калі і стартуе акцыя. Паслямі праекта сталі вядомыя жанчыны-маці — тэлевядучая Святлана Бароўская, спявачка Ларыса Грыбалёва, топ-мадэль Кацярына Даманькова.

Акцыя будзе доўжыцца сем месяцаў, за гэты час маладым маці плануюць уручыць 14 тысяч каробак (штомесяц у сталіцы нараджаецца каля дзвюх тысяч дзетак). Ініцыятыву падтрымала Міністэрства аховы здароўя.

— Мы рады любому пачынанню, калі яно скіравана на падтрымку нараджальнасці. У Беларусі, як і ў Еўропе, на жаль, чым лепш мы жывём, тым менш нараджаем. Разам з «МамаPro» мы не толькі дорым падарункі, але і адкрылі радзільныя дамы для наведвання. І высветлілася, што свякі не перашкаджаюць, а дапамагаюць, — падзялілася **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі і экспертызы Міністэрства аховы здароўя Алена БОГДАН.**

Спецыяліст паведаміла, што праект закона «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове здароўя» накіраваны ў Савет Міністраў. У ім, у прыватнасці, утрымліваецца новая норма — стварэнне ўмоў для сямейнага перадабортнага кансультавання.

— Увядзенне перадабортнага кансультавання для жанчын некалькі гадоў таму дазволіла захаваць 1,5 тысячы жыццяў, спадзяёмся, што такая практыка для ўсёй сям'і дазволіць захаваць 3-4 тысячы жыццяў.

Пра старт акцыі аб'явілі ў сценах 5-й гарадской клінічнай бальніцы, дзе з пачатку года нарадзілася рэкордная ў Мінску колькасць дзяцей.

— З моманту адкрыцця новага корпуса, за чатыры гады ў нас нарадзілася 20 тысяч дзяцей, у тым ліку летась 5,5 тысячы, — расказала **намеснік галоўнага ўрача па акушэрска-гінекалагічнай дапамозе 5-й гарадской клінічнай бальніцы Марына ШКРОБ.** — Пацыенткам заўсёды прыемна, калі пра іх клапоцяцца, таму ў такі важны момант у жыцці ў іх будзе яшчэ адна радасць.

Марына Шкроб прадэманстравала журналістам і знакамітым мамам радзільныя залы. Корпус радзільнага дома 5-й клінічнай бальніцы будаваўся нядаўна, ён у сталіцы самы новы і сучасны. Усе радзільныя залы і палаты прадугледжваюць сумеснае знаходжанне маці і дзіцяці і маюць камфортныя ўмовы для партнёрскіх родаў. Тут маецца ўся неабходная мэбля і абсталяванне для мамы, яе партнёра і немаўляці. Кацярына Даманькова, якая сваіх траіх дачок нарадзіла ў Францыі, адзначыла, што ўмовы ў беларускім радзільным доме яе па-сапраўднаму ўразілі і не адрозніваюцца ад замежных клінік.

Алена БОГДАН і Кацярына ДАМАНЬКОВА.

Алена КРАВЕЦ.

КАРАНІ і КРОНЫ

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя

№ 6 (44)

Міжнароднае супрацоўніцтва

Ад абыходжання з адходамі да змены клімату

Гэтыя і іншыя пытанні абмяркуюць падчас V пасяджэння Міждзяржаўнага экалагічнага савета дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў (МЭС СНД), якое праходзіць 17—18 верасня ў Ерэване (Рэспубліка Арменія). Ад Беларусі ўдзел у мерапрыемстве прымае міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй ХУДЫК.

minpriroda.gov.by

Падчас сустрэчы міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь і міністра навакольнага асяроддзя Рэспублікі Арменія.

Падчас пасяджэння будзе разгледжана шырокае кола пытанняў, звязаных з забеспячэннем прыродаахоўнай дзейнасці. Дзяржавы — удзельніцы МЭС СНД абмяняюцца вопытам работы ў такіх галінах, як абыходжанне з адходамі, уніфікацыя метадаў разліку выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасфернае паветра, рэалізацыя дзяржаўнай экалагічнай палітыкі і іншыя.

Як расказалі ў прэс-службе Мінпрыроды, кіраўнік прыродаахоўнага ведамства падзеліцца вопытам, якія захады наша краіна робіць па рэалізацыі абавязацельстваў у галіне барацьбы са зменай клімату.

16 верасня Андрэй Худык сустрэўся са сваім армянскім калегам Эрыкам Грыгаранам. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі ход рэалізацыі Мемарандума аб супрацоўніцтве ў галіне аховы навакольнага асяроддзя паміж прыродаахоўнымі ведамствамі краін, які быў падпісаны ў 2016 годзе.

Асаблівая ўвага была ўдзелена пытанням інтэнсіфікацыі двухбаковага супрацоўніцтва ў прыродаахоўнай дзейнасці, у тым ліку ў сферы барацьбы са зменай клімату. Бакі адзначылі высокі ўзровень узаемадзеяння на пляцоўках міжнародных шматбаковых мерапрыемстваў, а таксама ў ходзе рэалізацыі праектаў міжнароднай тэхнічнай дапамогі ў рамках Усходняга партнёрства.

Андрэй Худык заклікаў разам падумаць над актывізацыяй работы МЭС СНД і ў якасці магчымых кірункаў сумеснай дзейнасці прапанаваў: змякчэнне наступстваў і адаптацыю да змены клімату, кіраванне ААПТ і стварэнне біясферных рэзерватаў, эканамічныя механізмы ўстойлівага прыродакарыстання.

17 верасня Андрэй Худык правёў сустрэчу са старшынёй Камітэта аховы навакольнага асяроддзя пры Урадзе Рэспублікі Таджыкістан Даўлатшохам Курбаналі Гулмахмадзода. Удзельнікі сустрэчы абмеркавалі неабходнасць падрыхтоўкі двухбаковага пагаднення аб супрацоўніцтве паміж ведамствамі. Андрэй Худык таксама выступіў з ініцыятывай наладзіць абмен вопытам у галіне правядзення дзяржаўнай экалагічнай экспертызы, а таксама найлепшымі практыкамі ў іншых сферах прыродаахоўнай дзейнасці, якія ўяўляюць узаемны інтарэс.

Наступнае, VI пасяджэнне МЭС СНД пройдзе ў 2020 годзе ў Мінску.

Настасся АЛЯКСЕЕВА.

Парадак на зямлі

Руплівасць супраць агрэсараў

Увядзенне зямель у гаспадарчы абарот — важны этап пасля ачышчэння тэрыторый ад інвазійных раслін

Сёння ў нашай краіне вядзецца сур'ёзная работа па знішчэнні «зялёных агрэсараў» — распрацоўваюцца і рэалізуюцца планы навядзення парадку на зямлі, рэгулявання распаўсюджвання і колькасці інвазійных раслін. Тэрытарыяльныя органы Мінпрыроды праводзяць маніторынг тэрыторый, ацэньваюць, наколькі эфектыўна (што датычыцца выкарыстання тэхналогій і асваення фінансавых сродкаў) землекарыстальнікі змагаюцца з інвазіяй. Але кіраўніцтва краіны і Мінпрыроды ўпэўнены: неабходна пераходзіць да наступнага этапу гэтай барацьбы — уцягвання зямель, ачышчаных ад інвазійных раслін, у гаспадарчы абарот. Падчас прэс-тура журналісты даведаліся, як гэта адбываецца ў Мінскім і Валожынскім раёнах.

Знайдзі сумнік!

Мінскі раён — адзін з лідараў па распаўсюджанасці сумніка канадскага. Менавіта на тэрыторыі сталіцы і ў радыусе 60—70 кіламетраў ад яе адзначана 80 % усёй папуляцыі гэтай інвазійнай расліны ў нашай краіне.

Яшчэ нядаўна і тэрыторыя аграгарадка Хацежына, што побач з трасай Мінск—Гродна, не радавала сваім знешнім выглядам. На ёй пасяліліся адразу два агрэсіўныя віды.

— У 2009 годзе на гэтым участку быў сфарміраваны квартал жылой забудовы, частка зямель засталася для добраўпарадкавання і азелянення, — уводзіць у курс справы **старшыня Хацежынскага сельвыканкама Юрый СТУКАЎ.** — На ёй і пачалі расці сумнік канадскі і баршчэўнік Сасноўскага.

У рамках мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі тэрыторыю замацавалі за ААТ «Налан». На працягу трох-чатырох гадоў яна рэгулярна скошвалася. Летась сельвыканкам сумесна з прадпрыемствам і мясцовымі жыхарамі высадзіў на частцы тэрыторыі дубы і яблыні. У выніку пра тое, што тут калісьці былі зарасці сумніку, нагадваюць толькі кволыя парасткі, што выпадкова трапляюцца на вочы, ды адзіночныя асобіны баршчэўніку і сумніку на ўскрайку лесу.

— Тэхналогія, ужытая на гэтай тэрыторыі, — частка комплекснага плана, — расказвае **загадчык сектара кадастра расліннага свету Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча, кандыдат біялагічных навук Алег МАСЛОЎСКІ.** — Ён прадугледжвае не толькі выдаленне агрэсіўнага віду, але і сяўбу шматгадовых траў. У выніку на шчыльным газоне сумнік не вытрымлівае канкурэнцыі і выцясняецца абарыгеннымі відамі.

Добры эфект у барацьбе з інвазійнымі раслінамі дасягаецца толькі тады, калі работа праводзіцца ў комплексе: скошванне, апрацоўка, засеў шматгадовымі травамі, фарміраванне драўняных насаджэнняў, а таксама кантроль не толькі заражанай тэрыторыі, але і патэнцыйна небяспечнай. Калі нейкую стадыю прапусціць, сумнік ці баршчэўнік лёгка адновіць сваю колькасць за год-два.

Каб гэтага не атрымалася, спецыялісты Мінскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя праводзяць маніторынг тэрыторый і працуюць з землекарыстальнікамі.

Насенне баршчэўніку захоўвае ўсходжасць на працягу 10—12 гадоў.

— Калі яны не прымаюць адпаведныя меры, ім выдаюцца прадпісанні з указаннем тэрмінаў ліквідацыі гэтых парушэнняў, — расказвае **начальнік інспекцыі Кацярына ПАЛЯШЧУК.** — А калі і яны не выконваюцца, землекарыстальнікі прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці. За гэты год мы склалі больш за 20 пратаколаў на суму каля 2000 рублёў.

Так, за непрыняцце мер адносна сумніку канадскага быў прыцягнуты да адказнасці старшыня Каладзішчанскага сельвыканкама. Сума штрафу склала 10 базавых велічынь. Пасля чаго, па словах Кацярыны Паляшчук, знайшліся і магчымасці, і сілы, і час, каб прывесці тэрыторыю сельсавета ў парадак. Пры гэтым на барацьбу з інвазійнымі раслінамі выдзяляецца дастаткова сродкаў з бюджэту, ствараюцца ўсе ўмовы для зацікаўленых у гэтым землекарыстальнікаў.

Замест пусткі — засеянае поле

Калі ў Мінскім раёне галоўны «антыгерой» — сумнік канадскі, то на Валожыншчыне гэта баршчэўнік Сасноўскага. У 1980-х гадах апошняга завезлі ў дзве мясцовыя гаспадаркі вырошчваць на корм жывёлам. З цягам часу баршчэўнік перасталі выкарыстоўваць для гэтых мэт, а землі пад ім не апрацоўваліся. Так расліна і захапіла вялікую тэрыторыю.

— У Валожынскім раёне інвазійныя расліны займаюць агулам 40,96 га, — расказвае **начальнік Валожынскай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Віктар ЯКУТОВІЧ.** — Пры гэтым 36,4 % усяго баршчэўніку расце на землях ААТ «Суднікаўскае». Толькі на ўчастку каля МТФ «Суднікі» ім было занята каля 6 га зямлі.

Сёння частка гэтай тэрыторыі ўжо апрацавана і засеяна. На чарзе — участак плошчай каля 3 га. Тут ужо правялі механічнае кашэнне і хімічную апрацоўку, а цяпер глебу заворваюць, каб вясной пасеяць кукурузу.

Па словах **начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Мікалая СВІДЗІНСКАГА**, калі баршчэўнік Сасноўскага і сумнік канадскі пераможаныя, важна на наступным этапе ўцягнуць такія землі ў гаспадарчы абарот. Гэта можа быць жыллёвае ці прамысловае будаўніцтва, стварэнне лясных культур ці, як на гэтай тэрыторыі, выкарыстанне зямель для атрымання сельгаспрадукцыі. Сёння ў краіне налічваецца каля 1500 га зямель, вызваленых ад баршчэўніку, якія можна і трэба ўцягнуць у гаспадарчую дзейнасць.

— Работа, якая вядзецца ў Валожынскім раёне, — выдатны прыклад для землекарыстальнікаў, кіраўнікоў усіх узроўняў і формаў уласнасці, як дзейнічаць пасля таго, як работа па нераспаўсюджванні інвазійных відаў праведзена, — адзначае прадстаўнік Мінпрыроды.

Вераніка КОЛАСАВА.
Фота аўтара.

- **У Мінскім раёне выяўлена больш за 330 папуляцый сумніку канадскага агульнай плошчай каля 80 га.**
- **Папуляцыі ў краіне баршчэўніка Сасноўскага займаюць плошчу 3600 га.**

Грошы на вецер

Каля 40 мільёнаў долараў замежных інвестыцый прыцягнута ў Беларусь для праекта па будаўніцтве ветрапарка

Наша краіна яшчэ на крок наблізілася да будаўніцтва найбуйнейшага ветрапарка і дасягнення мэты па ўкараненні аднаўляльных крыніц энергіі да 2030 года. Для інвеставання ў будаўніцтва ветраэлектрастанцыі магутнасцю 25 МВт паблізу вёскі Веляшковічы ў Лёзненскім раёне Віцебскай вобласці была абраная турэцкая кампанія «Гурыш» (Gurish Construction & Engineering Co. Inc.) — сусветна вядомы распрацоўшчык экалагічна чыстых інжынерных рашэнняў.

Пасля ўзгаднення ўсіх неабходных дакументаў 30 жніўня адбылося падпісанне дагавора, згодна з якім агульны аб'ём інвестыцый у новы ветраэнергетычны парк павінен скласці каля 40 мільёнаў долараў ЗША.

«Дзякуючы праекту «Ліквідацыя бар'ераў для развіцця ветраэнергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь» у нашу краіну прыходзяць прамыя інвестыцыі, накіраваныя на развіццё «зялёнай» эканомікі і аднаўляльных крыніц энергіі. Ветрапаркі зробяць наша навакольнае асяроддзе чысцейшым і паспрыяюць паляпшэнню якасці жыцця мясцовага насельніцтва», — адзначыў **намеснік міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандр КОРБУТ.**

Праект міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Ліквідацыя бар'ераў для развіцця ветраэнергетыкі ў Рэспубліцы Беларусь» рэалізуецца Мінпрыроды пры падтрымцы Праграмы развіцця ААН і Глабальнага экалагічнага фонду. Будаўніцтва ветрапарка плануецца пачаць у 2020 годзе, пасля таго як інвестар распрацуе падрабязную праектную дакументацыю.

Пасля завяршэння будаўніцтва ветраэлектрастанцыя «Веляшковічы» стане найбуйнейшым вытворцам энергіі з ветру ў Беларусі, які будзе пастаўляць экалагічна чыстую энергію ў больш чым 20 тысяч хатніх гаспадарак у гэтым раёне. Чакаецца, што эксплуатацыя ветрапарка на працягу наступных 20 гадоў дазволіць скараціць больш за 500 тысяч тон выкідаў CO_2. Для забеспячэння эксплуатацыі і тэхнічнага абслугоўвання аб'екта будзе створана пяць новых працоўных месцаў. Будаўніцтва ветрапарка таксама забяспечыць работай мясцовыя будаўнічыя арганізацыі і пастаўшчыкоў абсталявання.

Фота Анатоля КПЕШНІКА.

Між тым, як адзначаюць эксперты праекта, існуючыя тэмпы развіцця аднаўляльных крыніц энергіі (АКЭ) у нашай краіне досыць павольныя. На пачатак 2019 года іх доля ў валавым спажыванні паліўна-энергетычных рэсурсаў складала 6,2 %. Цяпер па ўсёй краіне працуюць 96 ветратурбін агульнай магутнасцю 100,95 МВт.

Маргарыта ДРАЗДОВА.

Біяразнастайнасць

У «гасцях» добра, а дома — лепш

У Налібоцкай пушчы ствараюць кармавыя ўгоддзі для зубра, каб утрымаць звера ў межах заказніка і мінімізаваць шкоду для сельгаспрадпрыемстваў

Зубры ў Налібоцкую пушчу былі завезены з Белавежскай пушчы яшчэ ў 1994 годзе. За гэтыя гады колькасць беларускіх волатаў тут значна вырасла — з сямнаццаці асобін прыблізна да ста жывёл, падзеленых на сем груповак. Змяніліся і ўмовы існавання для іх: былыя сенакосы і пашы, дзе жывёлы харчаваліся, пачалі зарастаць хмызнякамі, забалочвацца. У выніку звяры зімой сталі наведвацца на сельскагаспадарчыя ўгоддзі, што знаходзяцца побач з заказнікам, наносячы значную шкоду мясцовым гаспадаркам.

Фота з архіва ПРААН.

Для налібоцкай мікрапапуляцыі зуброю распрацуюць генетычныя пашпарты.

На стварэнне кармавых угоддзяў для зубра ў Налібоцкай пушчы накіраваны праект «Ветландс», які фінансуецца Глабальным экалагічным фондам і рэалізуецца ПРААН у партнёрстве з Мінпрыроды. У яго рамках была закуплена спецыяльная тэхніка, з дапамогай якой балотна-лугавыя ўгоддзі ачышчаюцца ад куставой і дрэвавай расліннасці.

Як расказаў **дырэктар ДПУ «Рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Налібоцкі» Васіль ГУРКОЎ**, летась была праведзена рэканструкцыя меліярацыйнай сістэмы ва ўрочышчы «Цякава», выдалена дрэвава-куставая расліннасць, пачышчана меліярацыйная сетка, узараная глеба. Сёлета на гэтых тэрыторыях пасеялі сумесь траў — аўсяніцу, каласоўнік і цімафееўку, а таксама гароха-аўсяную сумесь. Ураджай атрымаўся даволі важкі — назапашана каля 100 тон кармоў.

Каб утрымаць зуброў у межах заказніка, у зімні перыяд іх падкормліваюць на спецыяльных пляцоўках. Усяго іх сем, тры з іх (комплексныя) былі пабудаваныя ў рамках праекта. Падкормачныя пляцоўкі ўключаюць у сябе збожжасховішча, кармушкі для збожжа, сена, грубых кармоў і наглядальную вышку. Плануецца, што з дапамогай апошняй за жывёламі будуць назіраць не толькі вучоныя і супрацоўнікі заказніка, але і экатурысты.

Праведзеная работа дала плён: па словах Васіля Гуркова, зімой зубры не выходзілі за межы заказніка. Не атрымалася іх стрымаць толькі на пачатку вясны. Пры гэтым на ачышчаныя ад зараснікаў угоддзі зубры пачалі выходзіць не позняй восенню, як раней, а яшчэ на пачатку лета.

А каб стварыць сапраўды самарэгулявальную ўстойлівую сістэму, у заказнік з Нідэрландаў нядаўна былі завезены тарпанападобныя коні. З'ядаючы расліннасць, яны, як грэйдары, выраўноўваюць покрыва на гэтай тэрыторыі, утвараючы зялёны лужок, дзе пазней змогуць харчавацца зубры.

— Калі сістэма зможа падтрымліваць гэтыя тэрыторыі ў належным стане без удзелу чалавека, пры дапамозе тэхнікі мы зможам займацца ачысткай іншых тэрыторый, — падкрэсліў Васіль Гуркоў.

Ужо гэтай восенню ў заказніку ўстановяць спецыяльна закупленыя праектам фотапасткі, якія дазволяць ацэньваць паводзіны зуброў у зімовы перыяд і адсочваць, як яны будуць асвойваць падрыхтаваныя для іх тэрыторыі.

Вераніка КОЛАСАВА.

Генетычны пашпарт для зубра

У рамках праекта «Ветландс» у заказніку «Налібоцкі» праводзіцца генетычнае даследаванне налібоцкай мікрапапуляцыі зуброў. Спецыялісты НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах узялі біяпробы ў зуброў, што жывуць вольна, з іх была паспяхова выдзелена ДНК для далейшага аналізу. Вучоныя параўнаюць атрыманыя вынікі з базамі даных, створанымі ў Еўропе, каб ацаніць, якія генетычныя праблемы існуюць у зуброў, што жывуць у «Налібоцкім», і вызначыць неабходнасць генетычнага аздараўлення гэтай мікрапапуляцыі.

Тэхналогіі для будучыні

Захаваць азонавы слой!

Што робяць, каб ён не разбураўся

З 2020 года ў Беларусь больш нельга будзе завозіць азонаразбуральныя рэчывы, а з 2030-га — выкарыстоўваць абсталяванне, што працуе пры іх дапамозе, падкрэслілі спецыялісты.

Азонавы слой абараняе Зямлю ад шкоднага ўздзеяння ўльтрафіялетавага сонечнага выпраменьвання і падтрымлівае на планеце аптымальныя тэмпературныя рэжымы. Аднак чалавек значна ўплывае на яго стан. Яшчэ ў мінулым стагоддзі азонавы слой пачаў разбурацца, і адна з асноўных прычын гэтага — актыўнае ўжыванне хімічных рэчываў, якія ўтрымліваюць у сваім складзе хром альбо бром. Яны выкарыстоўваюцца ў якасці холадагентаў у сектарах астуджэння і кандыцыянавання паветра, прапелентаў у бытавой і медыцынскай аэразольнай прадукцыі, пажаратушыльных агентаў у сістэмах гашэння агню, растваральнікаў у электронным машынабудаванні, успеньвальніка пры вытворчасці будаўнічых матэрыялаў.

Беларусь адна з першых падпісала Венскую канвенцыю аб ахове азонавага слоя і Манрэальскі пратакол па рэчывах, што яго разбураюць. У 2001 годзе ў краіне быў прыняты Закон «Аб ахове азонавага слоя».

— Да Манрэальскага пратакола далучыліся 197 краін. Ён рэгулюе 114 розных хімічных рэчываў, больш за 50 % з іх ужо выведзены з ужытку, — адзначыла **консультант упраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра, змены клімату і экспертызы Мінпрыроды Наталля КЛІМЕНКА**. — У нашай краіне азонаразбуральныя рэчывы ніколі не вырабляліся, таму наша задача сёння — не дапусціць іх імпарту. Таксама мы разам з іншымі краінамі займаемся вывадам апошняй групы такіх рэчываў — гідрахлорфторвуглярадаў. Да 2020 года іх не павінна застацца ў Беларусі.

Спецыяліст дадала, што да 2030 года з абароту будзе выключана і абсталяванне, якое працуе на азонаразбуральных рэчывах. Пакуль для яго дазапраўкі плануюць выкарыстоўваць запасы, зробленыя да 2020 года, альбо адноўленыя рэчывы, якія прайшлі рэцыркуляцыю. Пасля гэтага, лічаць эксперты, найлепшай альтэрнатывай будуць прыродныя холадагенты.

— У адпаведнасці з заканадаўствам на Мінпрыроды і яго тэрытарыяльныя органы ўскладзены кантроль за выкананнем умоў Манрэальскага пратакола. За час яго дзеяння з 1987 года выкарыстанне азонаразбуральных рэчываў скарацілася на 99 %, — расказала Наталля Кліменка. — Раз на тры гады мы праводзім інвентарызацыю абсталявання, якое працуе на такіх рэчывах. Напрыклад, па звестках на пачатак 2018 года яго засталося каля 2,5 тысячы адзінак, ім карысталіся прыблізна 300 арганізацый.

Кацярына ЦІТОВА.

У свеце жывёл

ПОШУКІ СУСЛІКАЎ

Мілыя грызуны, якіх засталося вельмі мала, у нас усё-ткі ёсць!

У Беларусі знайшлі дзесяць калоній суслікаў. У самай вялікай з іх — у Нясвіжскім раёне — жыве каля тысячы звяркоў! Як навукоўцы збіраюцца абараняць грызуноў, занесеных у Міжнародную Чырвоную кнігу?

«Магчыма, самая буйная папуляцыя ў Еўропе»

— Глядзіце, там іх штук семдзесят, — паказвае нам кудысьці ўдалячынь **дырэктар ААТ «Юшавічы» Алег ВІНАГРАД**, пакуль мы ў біноклі спрабуем «злавіць» хоць аднаго шустрага суслiка. Яшчэ з 1991 года ён назірае за гэтымі мілымі звяркамі на сваіх угоддзях, але нават не падазраваў пра іх ахоўны статус.

— Трыццаць гадоў таму я прыехаў сюды па размеркаванні і ўвесь гэты час бачыў у нашых месцах суслікаў. Яны вельмі любяць гарачае надвор'е, а вось у дождж хаваюцца, — апавядае Алег Сцяпанавіч. — Тут раней была паша, траву выядалі жывёлы. Аказалася, грызунам якраз такія ўмовы і патрэбныя.

Пра тое, што недалёка ад Нясвіжа жыве амаль тысяча суслікаў, акрамя мясцовых жыхароў ніхто не здагадваўся. У 1960-х гадах іх практычна цалкам знішчылі, бо думалі, што звяркі псуюць азімыя. Аднак навукоўцы адзначаюць, што гэтыя жывёлінкі не могуць нанесці сур'ёзнай шкоды палявым угоддзям, бо жывуць на старых вытаптаных пашах і харчуюцца травой.

Знайсці новыя калоніі грызуноў дапамагла ініцыятыва грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» «Хамяк, суслік і палятуха: выратаваць супергрызуноў!» у рамках праекта «Экаманіторынг», што фінансуецца ЕС і рэалізуецца ПРААН у партнёрстве з Мінпрыроды.

— У мяне цікавасць да суслікаў з'явілася яшчэ 8 гадоў таму. Тады паступіла інфармацыя, быццам яны ёсць у Карэліцкім раёне. Але, як я ні спрабаваў, адшукаць іх не ўдалося. З тых часоў пачаў збіраць звесткі пра гэтых грызуноў і ўважліва іх вывучаць, — расказаў **эксперт АПБ Сяргей ШАКАЛА**, які разам з калегамі Юрыем Янкевічам і Андрэем Абрамчуком з дапамогай мясцовых жыхароў сёлета выявіў дзесяць калоній.

Фота Аляксандра ВІНЧЭЎСКАГА.

Рабы суслік уключаны ў Міжнародную Чырвоную кнігу як глабальна пагражальны від.

Спецыяліст падкрэсліў, што нясвіжская калонія работа суслiка — не проста наш нацыянальны здабытак. Магчыма, гэта самая буйная папуляцыя ў Еўропе.

Суслікі — вельмі ўразлівыя жывёлы. Чалавек можа нашкодзіць ім, нават не ўсведамляючы гэтага, напрыклад ненаўмысна разарацца поле, дзе жывуць звяркі, або «ўгнаіць» яго пестыцыдамі. Таксама колькасць гэтых грызуноў скарачаецца, калі лугі зарастаюць, а паколькі цяпер уводзяцца новыя, стойлавыя ўмовы ўтрымання буйной рагатай жывёлы, праблема гэта актуальная. Пакутуе звярок і ад натуральных фактараў — драпежнікаў і неспрыяльных умоў надвор'я. Статыстыка сведчыць, што 50—70 % суслікаў гіне пасля першай зімоўкі.

— Паводле ўлікаў колькасці грызуноў, якія мы папярэдне праводзілі на гэтым полі, шчыльнасць засялення на асобных плошчах проста неверагодная. Напрыклад, на ўчастку ўсяго 50 на 50 метраў мы выявілі 230 нор — не ведаю, дзе ў Беларусі яшчэ можна знайсці столькі. Гэта проста ўнікальнае месца, якое важна захаваць! І для гэтага мы будзем цяпер працаваць з насельніцтвам, праводзіць пастаянныя выезды і маніторынгі, — расказаў Сяргей Шакала.

Начальнік Нясвіжскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Юрый ГРЫНКЕВІЧ, у сваю чаргу, падкрэсліў, што за знішчэнне папуляцыі суслiка ў адпаведнасці з артыкулам 15.32 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях прадугледжаны штраф у памеры да 200 базавых велічынь.

Артыстычны, як сурыкат

Спецыялісты адзначаюць, што суслікі хутка могуць стаць адной з галоўных славутасцяў Нясвіжскага раёна. Магчыма, нават з'явіцца кірунак накшталт бёрдвотчынгу, які будзе цікавы як мясцовым, так і замежным турыстам.

— Калі я ўпершыню ўбачыў гэтых звяркоў, быў проста ў захапленні ад іх мілавіднасці і падумаў, што сваёй артыстычнасцю яны не саступаюць знакамітым сурыкатам, — падзяліўся ўражаннямі **дырэктар АПБ Аляксандр ВІНЧЭЎСКІ.** — Суслікі цалкам могуць стаць турыстычным брэндам, дастаткова толькі сур'ёзна заняцца гэтым пытаннем — навучыць людзей апавядаць пра гэтых грызуноў, зрабіць тэматычныя сувеніры. Упэўнены, тых, хто пажадае паназіраць за жыццём звярка, знойдзецца шмат, бо нават не ўсе заолагі бачылі яго жыўцом.

Эксперты падкрэсліваюць: іх чакае яшчэ шмат работы, каб «сабраць па крупінках» асноўныя месцы рассялення суслiкаў. Яшчэ больш сіл спатрэбіцца для іх захавання, бо магчымасцяў знішчыць папуляцыі сёння шмат.

Каб захаваць гэтых грызуноў у Беларусі, трэба знайсці як мага больш іх калоній, а таксама арганізаваць мясцовых актывістаў, якія зацікаўлены ў гэтым. Калі вам вядома пра магчымыя месцы рассялення работа суслiка, паведаміце ў АПБ: levy@ptushki.org.

Кацярына ЦІТОВА.

Як выявіць калонію суслікаў?

Паселішчы гэтых грызуноў знаходзяць па характэрных норах. Каля часовых нор дыяметрам каля 5,5 см заўсёды ёсць грудок выкінутай зямлі, пакуль звярок іх пагыбляе. Ад іх разыходзяцца добра прыкметныя «сцяжынкі».

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Пуховичский пищекомбинат», в лице антикризисного управляющего Боброва Д. А. в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) проводит открытый аукцион по продаже

№ Лота	Наименование объекта	Начальная цена без НДС, бел. руб.	Размер задатка (10 %), бел. руб.
1	**Дебиторская задолженность в размере 14 800,12** бел. руб. (Житковичское райпо)	14 800,12	1 480,00
2	**Дебиторская задолженность в размере 645,66** бел. руб. (ООО «Кейс Маркет»)	645,66	64,56
3	**Дебиторская задолженность в размере 393,12** бел. руб. (ОАО «Старица-Агро»)	393,12	39,31
4	**Дебиторская задолженность в размере 153,05** бел. руб. (ЧТУП «Декабрьский»)	153,05	15,30
5	**Дебиторская задолженность в размере 123 672,38** бел. руб. (ООО «Ювека»)	96,00	9,60
6	**Дебиторская задолженность в размере 123 672,38** бел. руб. (Столовая № 104)	123 672,38	12 367,23
7	**Дебиторская задолженность в размере 10 829,23** бел. руб. (Дорснабторг)	10 829,23	1 082,92
8	**Дебиторская задолженность в размере 36,46** бел. руб. (ТПООО«Пуховичиторг»)	36,46	3,64
9	**Дебиторская задолженность в размере 59 326,21** бел. руб. (ЗАО «Бланж»)	59 326,21	5 932,62
10	**Дебиторская задолженность в размере 760,00** бел. руб. (ООО «ТРОНСТ»)	760,00	76,00
11	**Дебиторская задолженность в размере 652,60** бел. руб. (ТУП «Слобода Розница»)	652,60	65,26
12	**Дебиторская задолженность в размере 780,00** бел. руб. (ОДО «Сер-Вак»)	780,00	78,00
13	**Дебиторская задолженность в размере 49 489,20** бел. руб. (ЧПТУП «Лучер»)	49 489,20	4 948,92
14	**Дебиторская задолженность в размере 2 112,00** бел. руб. (ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир»)	2 112,00	211,20
15	**Дебиторская задолженность в размере 3 868,80** бел. руб. (ОАО «Полимер»)	3 868,80	386,88
16	**Дебиторская задолженность в размере 37 774,17** бел. руб. (Норвэйторг)	37 774,17	3 777,41
17	**Дебиторская задолженность в размере 2 601,14** бел. руб. (Пуховичское райпо)	2 601,14	260,11
18	**Дебиторская задолженность в размере 645,66** бел. руб. (ОАО «Климовичский ликеро-водочный завод»)	645,66	64,56

Шаг аукциона — 5 (пять) процентов.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 10 (десяти) процентов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов, в указанный в извещении о проведении торгов срок, заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, — доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 3 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяются условиями о проведении торгов, ознакомиться с которыми можно в дни приема заявлений на участие в торгах, а также на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **23.10.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.10.2019** до **16.00** по указанному адресу. **Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17.**

ИЗВЕЩЕНИЕ об открытом аукционе по продаже имущества ОАО «Гродненская обувная фабрика «Неман» 22 октября 2019 года

	Лот № 1	Лот № 2*
Вид аукциона открытый		
Предмет аукциона	Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-32552 (склад материалов с гаражом) общей площадью 2983,0 кв. м с составными частями: сооружение с инвентарным номером 400/С-133598 (тепловая сеть), сооружение с инвентарным номером 400/С-133599 (благоустройство территории), сооружение с инвентарным номером 400/С-133600 (водопроводная сеть), сооружение с инвентарным номером 400/С-133601 (канализационная сеть)	Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-55077 (административное здание мини-рынка) общей площадью 44,8 кв. м с составными частями и принадлежностями: навес площадью 166,0 кв. м, асфальтобетонное покрытие площадью 5853,0 кв. м, покрытие из цементной плитки площадью 74,0 кв. м, бетонное покрытие площадью 86,0 кв. м, ограждение из железобетонных плит площадью 512,8 кв. м, металлические ворота – 2 шт., металлическая калитка. Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-55078 (здание туалета) общей площадью 85,0 кв. м с составными частями: навес площадью 23,4 кв. м
Начальная цена продажи	**1 236 924,00 руб. (в т. ч. НДС 20 %)**	**2 016 000,00 руб. (в т. ч. НДС 20 %)**
Кадастровые номера земельных участков и размеры	440100000001010781 0,3086 га	440100000001003576 0,6375 га
Месторасположение земельных участков	**г. Гродно, ул. Советских Пограничников, д. 95**	**г. Гродно, ул. Поповича, д. 6, д. 6/1**
Имущественное право земельных участков	Право постоянного пользования	Право аренды
Продавец	**Открытое акционерное общество «Гродненская обувная фабрика «Неман», г. Гродно, ул. Советских Пограничников, д. 95, тел.: 8(0152)520400, 527200**	
Сумма задатка	**123 692,40 руб.**	**201 600,00 руб.**
Организатор аукциона	Коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, д. 2/1, тел.: 720537, 720010	
Дата проведения аукциона	**22 октября 2019 года**	
Время проведения аукциона	12.00	
Место проведения аукциона	**г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, актовый зал**	
Место приема заявлений и прилагаемых к нему документов	г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет 407	
Дата и время начала приема документов	23 сентября 2019 года, 8.00	
Дата и время окончания приема документов	16 октября 2019 года, 17.00	

- по лоту № 2 использование объекта продажи для функционирования минирынка до 2021 года. Сохранение за действующими арендаторами права аренды мест для торговли, зданий и сооружений до окончания срока действия договоров.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24AKBB30120000418104000000 в филиале № 400 ГОУ ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY21400, УНП 590727594, получатель – КУП по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости». **Юридическое лицо:** доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов. **Физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 15 дней с момента заключения договора купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Адрес сайта: **www.grodno.gov.by**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703
Продавец	ООО «Папел», 220113, г. Минск, ул. Мележа, д. 5, корп. 1, офис 217, ком. 6

Предмет аукциона
Изолированное помещение, по адресу: г. Минск, ул. Трудовая, 6-1

Наименование (назначение), общая площадь, инвентарный номер	Начальная цена с НДС 20 %:
Баня (коммунально-бытовое помещение), общей площадью 493,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-1006040	1 095 535,00 бел. руб.

Ограничения/обременения: ипотека, залогодержатель – ОАО «Белорусский народный банк»

Дата и время проведения аукциона: 21.10.2019 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».
Дата и время окончания приема документов: 17.10.2019 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Продавец	ООО «БумБокс», Минская обл., Смолевичский р-н, Жодинский с/с, аг. Будагово, пристройка к АБК

Предмет аукциона
Капитальное строение по адресу: Минская обл., Смолевичский р-н, Жодинский с/с, д. Будагово

Наименование (назначение), общая площадь, инвентарный номер	Начальная цена с НДС 20 %:
Пристройка к АБК общей площадью 2038,0 кв. м, инвентарный номер 614/С-8324 Составные части и принадлежности: подвал	795 220,00 бел. руб.

Сведения о земельном участке: предоставлен на праве аренды по 17.09.2028 для обслуживания зданий и сооружений, общ. пл. 0.3611

Ограничения/обременения: ипотека, залогодержатель – ОАО «Белорусский народный банк»

Дата и время проведения аукциона: 22.10.2019 в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».
Дата и время окончания приема документов: 18.10.2019 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 10.00 до 16.00. Ответственное лицо: Селиванов Павел Олегович, контактный телефон +375 (44) 741 74 72

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, предусмотрен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Контактные телефоны	**+375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

Извещение о проведении повторного аукциона

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ООО «Кеанед», 220037 г.Минск, переулок 1-й Менделеева, 50-3, кабинет 13

Предмет аукциона — объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, по адресу: г. Минск, пер. Менделеева, 1-й 50 (2,3)

№ лот	Наименование (Назначение)	Начальная цена с НДС 20 %:
1	**Помещение общественного питания** общей площадью 635,2 кв. м, инвентарный номер 500/D-708163897 **Складское помещение общей площадью** 111,1 кв. м, инвентарный номер 500/D-708163898	**640 940,00 бел. руб.**

Объекты недвижимого имущества, реализуемые одним лотом, по адресу: Могилевская обл., г. Могилев, ул. Вишневецкого, 8а (3,4)

2	**Нежилое изолированное помещение** (Помещение, не относящееся к жилищному фонду) общей площадью 36,9 кв. м, инвентарный номер 700/D-101889 **Нежилое изолированное помещение** (Помещение, не относящееся к жилищному фонду) общей площадью 884,8 кв. м, инвентарный номер 700/D-101888	**520 770,00 бел. руб.**

Обременение: ипотека. Подробная информация у организатора аукциона

Дата и время проведения аукциона: 07.10.2019 в 12.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Продавец	ООО «Сплендор», Минская обл., Воложинский р-н, г. п. Ивенец, ул. Промышленная, 30, к. 1

Предмет аукциона – изолированное помещение по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 81/14-2

3	**Административное помещение** общей площадью 506,5 кв. м, инвентарный номер 200/D-149801	**182 750,00 бел. руб.**

Дата и время проведения аукциона: 07.10.2019 в 12.30 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Продавец	ООО «Кеакан», 220125, г. Минск, пр-т Независимости, 185, пом. 7

Предмет аукциона – изолированное помещение по адресу: г. Минск, ул. Краснозвездная, д. 9, пом.1Н

4	**Помещение неустановленного назначения** общей площадью 227,4 кв. м, инвентарный номер 500/D-690215	**148 000,00 бел. руб.**

Дата и время проведения аукциона: 07.10.2019 в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи:	**10** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 27.07.2019 г.

Дата и время окончания приема документов	**03.10.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».**
Контактные телефоны	+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by

СЕЗОН ЗАХВАРАЛЬНАСЦІ НЕ ЗА ГАРАМІ

Каго і за які кошт сёлета будуць вакцыянаваць ад грыпу?

Каля 3,7 мільёна чалавек сёлета плануецца прышчапіць у Беларусі ад грыпу. Вакцынацыя пачнецца ўжо з кастрычніка, каб да студзеня—лютага, калі вірус становіцца найбольш актыўным, сфарміраваўся імунітэт. Абавязкова прышчэпкі атрымаюць людзі з груп рызыкі — дзеці і пажылыя, пацыенты з цяжкімі хранічнымі захворваннямі, медработнікі і іншыя.

— Вакцынацыю пачнём, як толькі вакцына выйдзе з лабараторнага кантролю. Магчыма, нават у канцы верасня. Для фарміравання імунітэту неабходна ад 7 да 21 дня, — расказвае **загадчык аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка ВЫСОЦКАЯ.**

Імунітэт захоўваецца на 6—12 месяцаў, таму, нават калі вы прышчаплялі супраць грыпу летась, сёлета працэдуру варта паўтарыць. Тым больш што цяпер склад вакцын прыйшлося абнавіць з-за мутацый вірусаў групы А.

— Сусветная арганізацыя аховы здароўя адсочвае, якія вірусы грыпу цыркулююць на планеце, каб высветліць іх антыгенныя характарыстыкі і зразумець, якую вакцыну прымяняць. Звычайна рэкамендацыі на наступны сезон даюць у лютым, бо каб напрацаваць неабходны аб'ём вакцыны, патрэбна тры месяцы. Сёлета Сусветная арганізацыя аховы здароўя ўпершыню ўзяла паўзу, і толькі ў канцы сакавіка мы атрымалі рэкамендацыі. Бо вірусы групы А, сустракаючыся з імуннай праслойкай чалавека, муціравалі. Таму вакцына супраць іх была зменена. Прагназуецца, што ў нас па-ранейшаму будуць цыркуляваць вірусы групы А — H1N1 і H3N2 і вірусы групы В, — паведаміла **кіраўнік Нацыянальнага цэнтра па грыпе РНПЦ эпідэміялогіі і мікрабіялогіі Наталля ШМЯЛЁВА.**

Вакцынацыя ў гэтым сезоне будзе праводзіцца, як і летась, трохвалентнай і чатырохвалентнай вакцынамі. За кошт сродкаў рэспубліканскага і мясцовага бюджэтаў прышчапляць будуць расійскай вакцынай «Грыпол плюс» (ужо закуплена 1,5 мільёна доз па 1,5—2 рублі), за сродкі прадпрыемстваў і грамадзян — вакцынамі «Ваксігрып», «Ваксігрып тэтра» (Францыя), «Інфлювак» (Нідэрланды). Каштаваць такая прышчэпка трохвалентнай вакцынай будзе ў сярэднім ад 10 да 18 рублёў.

На думку спецыялістаў, вырабляць уласную вакцыну ў Беларусі немэтазгодна.

— У нас невялікая краіна. А працэс вытворчасці вакцыны дастаткова затратны. Каб вырабляць такую прадукцыю, патрэбны выхад на іншыя рынкі, а яны ўжо заняты. Каб вытворчасць вакцыны ў Беларусі акупілася, патрэбна не менш за 50 гадоў, — выказала меркаванне **намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН.**

Каля 40 % насельніцтва зрабілі прышчэпкі ад грыпу летась. У тым ліку 75 % з груп рызыкі.

— Мы прышчапілі каля 3,7 мільёна чалавек, у тым ліку 950 тысяч дзяцей. Эфектыўнасць сучаснай вакцыны ад грыпу складае ад 70 да 98 %. Гэта значыць з сотні прышчэпленых 70—98 чалавек не захварэе, — тлумачыць Вераніка Высоцкая. — Тыя, хто захварэў, маюць лёгкае цячэнне грыпу. Мы прааналізавалі мінулы сезон: сярод прышчэпленых захваральнасць у 12,3 раза ніжэйшая, чым у тых, хто не вакцыянаваўся. А 98,2 % з тых, хто захварэў на грып, прышчэпку не рабілі.

Спецыяліст паведаміла, што пяты сезон у Беларусі няма эпідэміі грыпу. Захваральнасць складае 10—16 чалавек на 100 тысяч насельніцтва.

Толькі вакцынацыя з'яўляецца спецыфічнай прафілактыкай грыпу. Неспецыфічныя сродкі ў барацьбе з інфекцыяй — стандартныя правілы здаровага спосабу жыцця. Гэта захаванне рэспіраторнага этыкету, каб не дапусціць распаўсюджання віруса; выкарыстанне аднаразовых папяровых насовак. У сезон пад'ёму захваральнасці лепш не знаходзіцца ў месцах збору людзей, не наведваць масавыя мерапрыемствы, па магчымасці не ездзіць у грамадскім транспарце. Часцей мыць рукі, паласкаць поласць рота і прамываць нос, паболей знаходзіцца на свежым паветры і часцей праветрываць пакой. Лекавыя метады прафілактыкі варта выкарыстоўваць толькі па рэкамендацыі ўрача. Імунастымулятары не прайшлі клінічныя выпрабаванні, і іх эфектыўнасць не даказана. Толькі ўрач можа меркаваць, што ў вас маецца імунадэфіцыт, і прызначыць такія сродкі.

— Мяне заўсёды здзіўляюць маладыя матулі, якіх у сезон захваральнасці ў аптэцы шмат, і яны ўсе набываюць імунамадулятары. Вы не ведаеце, у якім стане зараз знаходзіцца імунная сістэма дзіцяці, і тут важна не нашкодзіць. Дапамагчы такія сродкі наўрад ці змогуць, — падкрэсліла Іна Карабан.

ХУТКІ І НЕБЯСПЕЧНЫ

Сітуацыя з адром у Еўропе застаецца напружанай

У Беларусі з пачатку года зафіксавана 199 выпадкаў гэтай інфекцыі (летась за ўвесь год іх было 264).

У ліку выяўленых сёлета выпадкаў 56 — завозныя, астатнія — звязаныя з імі. Як вядома, адзёр валодае, бадай, адным з самых высокіх паказчыкаў кантагіёзнасці і лёгка перадаецца. Калі ў навакольных няма прышчэпкі, а адпаведна і імунітэту, верагоднасць захварэць вельмі вялікая. Але выпадкі адру ў нашай краіне, дзякуючы сфарміраванай імуннай праслойцы (прышчэпкі маюць 97—98 % беларусаў), не сталі масавымі. Ланцужок звычайна складаўся з 1—2 захварэлых.

Як паведаміла **намеснік начальніка аддзела гігіены, эпідэміялогіі і прафілактыкі Міністэрства аховы здароўя Іна КАРАБАН**, захворванне рэгістравалася ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Сярод захварэлых 71 % — дарослыя, астатнія — дзеці. Каля 54 % тых, хто перанёс адзёр, або не мелі прышчэпак ці даных пра іх, або мелі адну прышчэпку (імунітэт фарміруецца, як правіла, пасля дзвюх), астатнія былі вакцыянаваныя.

З пачатку 2018-га да ліпеня 2019 года адзёр выяўлялі ў жыхароў 49 з 53 краін Еўрапейскага рэгіёна. Захварэла 174 тысячы чалавек, з іх 100 хворых памерла. Характэрна, што ў 2019 годзе гэту інфекцыю перанесла ўжо 90 тысяч еўрапейцаў, што сведчыць пра больш імклівае, чым летась, распаўсюджанне адру. Найбольшая колькасць захварэлых ва Украіне — 54 тысячы, у Казахстане — 8,8 тысячы, Грузіі — 4 тысячы, Расіі — 3 тысячы, Турцыі і Францыі — па дзве тысячы, Польшчы і Балгарыі — па тысячы. Ва Украіне сёлета ад адру памерла 19 чалавек, а з пачатку эпідэміі — 39.

Вакцынацыя ад адру пачалася ў нас з 1967 года. Тады рабілі адну прышчэпку. З 1987 года прынята рашэнне рабіць другую прышчэпку монавакцынай. А з 1996 года дзяцей у Беларусі пачалі прышчэпліваць трохкампанентнай вакцынай (адзёр, паратыт, краснуха). З 2000 года краіна цалкам перайшла на трохвалентную вакцыну. Дзеці прышчапляюцца двойчы: у гадавалым і шасцігадовым узросце.

Да 1967-га на адзёр штогод на тэрыторыі Беларусі хварэла 50—80 тысяч чалавек. Лічыцца, што людзі, якія перанеслі гэту інфекцыю аднойчы, больш на яе не захварэюць.

ПА ЗДАРОЎЕ!

У Віцебску правялі спецыялізаваную выстаўку-кірмаш «Віцебшчына — за здаровы спосаб жыцця».

Сёлета традыцыйнае мерапрыемства адбылося дванаццаты раз. Сярод арганізатараў органы мясцовай улады, медыцынскі ўніверсітэт, аддзяленне Беларускай гандлёва-прамысловай палаты.

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Уладзімір ПЕНІН, падкрэсліў, што ў нашай краіне робіцца ўсё, каб грамадзяне атрымлівалі сучасныя комплексныя медыцынскія паслугі. А ўстановы аховы здароўя ў пацвярджэнне гэтага пазнаёмілі з новымі тэхналогіямі і падыходамі ў прафілактыцы і лячэнні захворванняў.

І ўсё больш прыкладаў, што глыбінка падцягваецца да сталічнага ўзроўню. Толькі ў Прыдзвінскім краі больш за чатыры тысячы басейнаў, спартыўных комплексаў, стадыёнаў, іншых спартыўных збудаванняў. І амаль штогод здаюцца пасля часткавага, капітальнага рамонту, мадэрнізацыі аб'екты фізкультуры і спорту.

Як заўсёды, на выстаўцы было чаму здзівіцца. Свае экалагічна чыстыя прадукты прэзентавалі вытворцы Віцебскай вобласці. Традыцыйна наведвальнікам спадабаліся дэгустацыі, віктарыны і конкурсы.

На выстаўцы можна было атрымаць кансультацыі педыятра, кардыёлага, эндакрынолага, алерголага, анколага, дэрматолага, задаць пытанні іншым так званым вузкім медыцынскім спецыялістам. Кожны мог прайсці экспрэс-абследаванне стану здароўя.

Перыядычна ў рамках выстаўкі арганізоўвалі розныя майстар-класы: ад скандынаўскай хады да догляду за скурай. Вучылі аказваць самадапамогу і дапамогу ў экстранных сітуацыях, напрыклад пры сімптомах інфаркту. Шмат ахвотных

было навучыцца гімнастыцы для вачэй, кантраляванню рацыёну, методыкам псіхалагічнага самарэгулявання. Ды і атрымаць навык правільна чысціць зубы лепш позна, чым ніколі.

Сярод удзельнікаў былі прадстаўнікі ўстаноў адукацыі, пазашкольнай работы, спартыўных секцый. Бацькі гутарылі з трэнерамі, кіраўнікамі гурткоў мастацкай самадзейнасці, кансультаваліся з медыкамі і псіхолагамі наконт таго, чым лепш займацца дзецям.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

АКУЛІСТ ДОЙДЗЕ ДА КОЖНАГА

Праект «Я бачу!» у Віцебскай вобласці пашырыўся

Цяпер тры брыгады афтальмолагаў правяраюць зрок у школьнікаў. Агляды ў межах дабрачыннага праекта аднавіліся з пачаткам навучальнага года. Да дзвюх дзеючых далучылася трэцяя брыгада, якая будзе працаваць у Браслаўскім і Пастаўскім раёнах. Гэта дазволіць урачам агледзець каля 15 тысяч сельскіх школьнікаў з усёй Віцебшчыны — 21 раёна.

З верасня да снежня мабільныя брыгады медыкаў працягнуць сваю работу ў Мёрскім, Талачынскім, Чашніцкім, Лёзненскім, Гарадоцкім, Віцебскім, Ушацкім, Шаркаўшчынскім, Шумілінскім, Полацкім, Лепельскім, Браслаўскім і Пастаўскім раёнах. У гэты перыяд каля 10 тысяч школьнікаў атрымаюць кансультацыі афтальмолагаў.

Яшчэ 5,5 тысяч дзяцей было абследавана падчас першага этапу акцыі — напярэдадні летніх канікул у сельскіх школах Аршанскага, Дубровенскага, Бешанковіцкага, Глыбоцкага, Докшыцкага, Расонскага і Сенненскага раёнаў. Больш чым у 30 % дзяцей выяўлены праблемы са зрокам. Агляды па месцы вучобы праходзяць для таго, каб вучні 1—11 класаў як мага раней даведаліся пра магчымыя парушэнні зроку і маглі своечасова атрымаць дапамогу. Усім неабходным для праверкі органаў зроку абсталяваны тры аўтамабілі, якія выкарыстоўваюцца для выязной работы ўрачоў. На выніках аглядаў школьнікі атрымліваюць заключэнні спецыяліста аб стане зроку, пры неабходнасці — рэцэпты і накіраванні на далейшую дыягностыку ці аператыўнае лячэнне. Усе дзеці атрымліваюць і памяткі з правіламі захавання здароўя вачэй.

Праект «Я бачу!» рэалізуецца Беларускім дзіцячым фондам і кампаніяй А1 пры падтрымцы Віцебскага аблвыканкама і Міністэрства аховы здароўя. Віцебская вобласць — чацвёрты рэгіён, дзе ён ажыццяўляецца.

Наш фармат

ПІШЫЦЕ, ВАС ЧЫТАЮЦЬ!

«Звязда» ўшанавала лаўрэатаў літаратурнага конкурсу

Днямі ў рэдакцыі адбылося ўзнагароджанне пераможцаў конкурсу апавяданняў сезона 2018/2019. Гэты праект ужо шмат гадоў ладзіць наша газета, даючы аўтарам пляцоўку для творчасці, а чытачам — магчымасць пазнаёміцца з новымі імёнамі і сучаснымі кірункамі беларускай літаратуры.

Нагадаем, сёлета ў тройку найлепшых твораў увайшлі апавяданні **Маргарыты Латышкевіч (I месца, «Казка пра ваўка»), Віктара Варанца (II месца, «Апошні форт») і Дзмітрыя Шулюка (III месца, «Як прыходзяць Каляды»).** Усе прызёры розныя — па ўзросце, жыццёвым досведзе, улюбёным пісьменніцкім стылі і жанры, — але аб'ядналіся высокім, насамрэч прафесійным узроўнем творчасці, трапяткім і адказным стаўленнем да слова. І хоць укласці літаратурны твор у абмежаваны фармат газетнай паласы часам вельмі няпроста, пераможцам конкурсу апавяданняў «Звязды» ўдалося зрабіць так, каб словам было цесна, а думкам — прасторна. Таму яшчэ раз і з вялікім задавальненнем віншуем лаўрэатаў, як, зрэшты, і ўсіх іншых удзельнікаў, чые апавяданні былі надрукаваныя ў конкурсе і знайшлі сваіх удзячных чытачоў. (А можа, знойдуць яшчэ і новых — у газетных падшыўках у бібліятэках і на нашым сайце www.zviazda.by)

«Гэты конкурс мае шырокую аўдыторыю і выходзіць за межы чыста літаратурнай суполкі, — адзначыў **вядучы конкурсу, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура», член Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь БАДАК.** — На сённяшні дзень «Звязда» — адзінае грамадска-палітычнае выданне, якое дае пісьменнікам магчымасць заявіць аб сабе, а таму, на мой погляд, конкурс павінен існаваць і працягвацца».

З вядучым, што вельмі прыемна для рэдакцыі, салідарныя і чытачы, якія тэлефануюць з пытаннем: «Вы ж не спынілі конкурс? А калі выйдзе наступнае апавяданне?» Таму ласкава запрашаем аўтараў, незалежна ад літаратурнага вопыту і рэгалій, у новы сезон конкурсу апавяданняў! Вам ёсць што сказаць шырокай аўдыторыі? Пішыце: у электронным выглядзе на пошту info@zviazda.by альбо на адрас: **газета «Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013,** з пазнакай «На літаратурны конкурс» і звесткамі пра сябе (колькі слоў самапрэзентацыі, сапраўдныя прозвішча і імя, дакладны паштовы адрас, кантактны тэлефон і поўныя пашпартныя даныя — нумар, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар). Да творчага спаборніцтва прымаюцца творы на беларускай мове, якія раней нідзе не друкаваліся, аб'ёмам да 10—12 тысяч знакаў. Будзьце ўважлівыя, разглядаецца толькі адно апавяданне ад аднаго аўтара.

Сумняваецеся ў сваіх сілах? Тады прыміце да ўвагі парады нашых лаўрэатаў.

«Мне здаецца, што маладых і трохі галодных да чытачоў аўтараў і падштурхоўваць не трэба да ўдзелу, хіба толькі расказаць шырэй, што ёсць такі конкурс, — мяркуе **Маргарыта ЛАТЫШКЕВІЧ.** — Працуючы рэдактарам аддзела прозы ў часопісе «Маладосць», я прачытала нямала вельмі яркіх і цікавых твораў, аўтары якіх, магчыма, яшчэ не зусім спрактыкаваныя, але як мінімум маюць свежыя погляды і ідэі. Нават калі яны не стануць пераможцамі, то напэўна ўпрыгожаць газету. Таму я падтрымліваю чытачоў, якія чакаюць у «Звяздзе» не толькі важных навін, аператыўных рэпартажаў і інтэрв'ю, але і новых апавяданняў».

«Я параіў бы будучым удзельнікам наогул «забіваць» на тое, што гэта конкурс. Конкурсы, прэміі, лаўрэацтвы — гэта нічога агульнага не мае з літаратурай, — разважае **Дзмітрый ШУЛЮК.** — Важна толькі давесці да ладу твор, і ён абавязкова дойдзе да чытача, а гэта самае галоўнае для пісьменніка».

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

«Звяздоўскі» конкурс — ужо нават не конкурс, а мерка добрага твора, — дадае **Віктар ВАРАНЕЦ.** — У нас у Гродзенскім дзяржаўным медуніверсітэце ёсць літаратурны клуб «Катарсіс», і нашы аўтары бяруць удзел у розных конкурсах. А калі прапануеш даслаць твор у «Звязду», многія не рашаюцца, бо ведаюць, што пастаўлена высокая планка, да якой трэба дацягнуцца. Газета вельмі аўтарытэтная, у ёй прэстыжна надрукавацца, і ты разумееш, што твой твор прачытае вялікая колькасць людзей — а калі ён да таго ж спадабаўся чытачам і журы, гэта так матывуе працаваць далей! Так што трэба пісаць, шаноўныя аўтары, а конкурсу — быць, і быць, і быць...»

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Сугучча

ЛЬВОЎ КНІЖНЫ СУСТРАКАЕ БЕЛАРУСЬ

У старажытным украінскім Львове з 18 да 22 верасня пройдзе 26-ы Форум выдаўцоў. Па традыцыі ўдзел у прэстыжным свяце кнігі возьме і дэлегацыя Беларусі. Мы звярнуліся да яе кіраўніка — генеральнага дырэктара Паліграфічнага камбіната імя Якуба Коласа Ігара МАЛАНЯКА з просьбай расказаць пра ўдзел у форуме, пра тыя праекты, з якімі беларусы едуць ва Украіну.

— Ігар Мікалаевіч, з якімі спадзяваннямі выпраўляецеся ў Львоў?

— Стэнд «Кнігі Рэспублікі Беларусь» мае быць досыць запатрабаваным, вартым увагі. З тых тысяч кніг, якія пабачылі свет у айчынных выдавецтвах за 2018, 2019 гады, мы адабралі для прадстаўлення ў суседняй краіне шмат пазнавальных, асветніцкіх выданняў, шмат кніг, альбомаў, якія б расказалі пра Беларусь ва ўсёй красе, ва ўсёй прыгажосці, адлюстравалі сённяшні стан сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, паказалі нашых людзей. Дарэчы, хацеў бы звярнуць увагу і на тое, што мы вязём у Львоў і кнігі ўкраінскіх аўтараў, якія пабачылі свет у Мінску ў перакладзе на беларускую мову. Напрыклад, выдатны раман Ірыны Данеўскай «Багуслаў Радзівіл». Дарэчы, твор стаў выдавецкай падзеяй у Беларусі. Кнігу ўжо прадстаўлялі і выдавец спадар Андрэй Янушкевіч, і сама аўтарка ў Міры ў Карэліцкім раёне, дзе Міністэрства інфармацыі краіны ладзіла свята «Кніжныя сустрэчы ў Мірскім замку». Спадзяюся, што супрацоўніцтва ўкраінскай пісьменніцы з беларускімі выдавецтвамі будзе досыць плённае. Нядаўна ў Мінску выдавец Зміцер Колас у сваёй знакамітай серыі «Паэты планеты» выдаў кнігу вершаў Сяргея Жадана «Вершы». Перакладчык — Андрэй Хадановіч. А ў «Колорградзе» пабачыў свет беларускі зборнік паэзіі Таццяны Дзюбы і Сяргея Дзюбы «Горад Зіма». Пераклад з украінскай мовы належыць Міхасю Пазнякову.

А наш Паліграфічны камбінат летась выдаў зборнік паэзіі «На арэлях натхнення», адкрыўшы ім серыю «Сябрына: паэзія Украіны». І гэтую кнігу мы сёлета таксама прэзентуем у Львове. Тым больш што ў ёй прадстаўлены пераклады твораў заходнеўкраінскіх паэтаў. І яшчэ зусім нядаўна мы выдалі беларускі пераклад аповесці кіеўскага празаіка Уладзіміра Даніленкі «Сонейка маё, чорнае і калматае». Раю прачытаць гэты твор усім падлеткам і іх бацькам. Вельмі цікава падаецца свет узаемаадносін розных пакаленняў.

— Ці дае львоўскі кніжны форум падставы для развіцця пэўных стасункаў у галіне паліграфіі, кнігавыдання, у справе прыцягнення інвестыцый у выдавецкую справу ў Беларусі?

— Гэта ці не самая галоўная задача, з якой мы едзем ва Украіну. У апошні час многія сувязі разладзіліся. Нават згубілася тое, што яшчэ літаральна дзесяць гадоў таму дапамагала нам выбудоўваць адносіны з калегамі з розных краін. Праўда, для вырашэння пытанняў імпартазабеспячэння сувязі дастатковыя — у плане набыцця самых розных матэрыялаў, абсталявання. А вось з замовамі на выпуск і продаж прадукцыі куды складаней. Таму, несумненна, будзем шукаць партнёраў. Як сярод паліграфістаў, так і сярод выдаўцоў, кнігагандляроў. Адно з нашых дасягненняў — выданне кніг шрыфтам Брайля для сляпых. Будзем шукаць замовы на гэтым кірунку.

— Украіна — досыць блізкая да нас краіна-суседка. І канешне ж, развіццю, умацаванню стасункаў характару эканамічнага, дзелавога супрацоўніцтва магла б паспрыяць дыпламатыя культурная, гуманітарная, творчая...

— І я таксама ўпэўнены ў яе вартасцях. Таму мы падрыхтаваліся і раскажам украінскім калегам пра тое, наколькі іх мастацкая літаратура выклікае цікавасць нашых пісьменнікаў, наколькі часта да перакладаў украінскай паэзіі, прозы звяртаюцца нашы часопісы «Полымя», «Маладосць», газета «Літаратура і мастацтва».

Львоўскі кніжны форум уражвае тым, што многія яго мерапрыемствы праходзяць за межамі выстаўкі — у музеях, бібліятэках, розных галерэях і тэатрах. І мы паспрабуем узяць гэты вопыт на ўзбраенне, каб нешта новае пасля прыйшло і на нашу Мінскую міжнародную кніжную выстаўку-кірмаш.

— Поспехаў, Ігар Мікалаевіч, у знаёмстве з Львовам кніжным! А ў дадатак да новых уражанняў — і новых стасункаў, якія паспрыяюць развіццю кніжнай Беларусі!

Гутарыў Мікола БЕРЛЕЖ.

Новыя кнігі

«Сямейнае чытанне»: праект Беларускага саюза жанчын

Накладам у 1000 экзэмпляраў у «Мастацкай літаратуры» ўбачыў свет зборнік беларускіх народных казак «Не сілай, а розумам». Серыйная пазнака наступная — «Сямейнае чытанне».

Ва ўступным «Слове да бацькоў» чытаем: «Дарагія сябры! Вы разгарнулі цудоўную кнігу, выдадзеную ў межах сацыяльна-творчага праекта Беларускага саюза жанчын «Сямейнае чытанне». Гэты праект распачаты пры падтрымцы міністэрстваў інфармацыі і адукацыі Рэспублікі Беларусь. Яго мэта — садзейнічаць умацаванню маральных каштоўнасцяў сям'і і грамадства, узмацненню ролі чытання і кнігі ў выхаванні дзяцей і падлеткаў. Чытанне і кнігі — найвялікшыя каштоўнасці. З імі ў кожную сям'ю ўваходзяць найлепшыя спадарожнікі жыцця — імкненне да новых ведаў, працалюбства, узаемадапамога, жаданне рабіць сваё наваколле прыгожым і асэнсаваным».

Дванаццаць народных казак, кожная з якіх вучыць жыццёвай мудрасці і ўзвышае чалавека ў дарозе да вяршынь дабрыні і справядлівасці, выдатна праілюстраваны Надзеяй Барай, Віталем Дударэнкам, Уладзімірам Даўгялам, Марыяй Каратаевай, Аленай Каравай-Лойка, Андрэем Пазняком. Знаёмства з кнігай «Не сілай, а розумам» — гэта яшчэ і выключная асалода ад твора паліграфічнага, кнігавыдавецкага мастацтва.

— Мяркуем, што праект, прапанаваны да рэалізацыі Беларускім саюзам жанчын, — кажа **дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь БАДАК,** — стане праектам, які пашырае прастору дзіцячага чытання. Да канца года ў серыі «Сямейнае чытанне» збіраемся выдаць яшчэ некалькі кніг. Спадзяёмся і на іх шырокую прэзентацыю ў школах і бібліятэках краіны.

Сяргей ШЫЧКО.

СОМ «ВЫПЛЫВАЕ» З ФАНІПАЛЯ Ў НАРАЧ

Пра незвычайныя арт-аб'екты, зробленыя жыхаром Фаніпаля Уладзімірам КАНОНІКАМ, «Звязда» неаднойчы расказвала. Напрыклад, пра тое, як на мінскай АЗС з'явіўся скульптурна-інтэрактыўны персанаж у выглядзе матацыкла-пантэры, на якога можна лёгка ўзабрацца, зручна пасядзець, памацаць педалі, ручкі, прыборы, зрабіць фота вузлоў і механізмаў мотаагрэгата.

Калі ў пачатку сёлетняй вясны ў сталіцы адкрываўся байкерскі сезон, на галоўнай пляцоўцы свята Уладзімір Канонік выставіў свой чарговы арт-аб'ект пад назвай «Веламотацмок», якога ён таксама сканструяваў з дапамогай непатрэбных, зношаных, зламаных, выкінутых на сметніцу аўтадэталяў. Наогул, многія скульптурныя кампазіцыі Уладзіміра Каноніка, створаныя з адходаў тэхрамонту, сталі часткай дызайнерскага афармлення тэрыторыі новых аўтазаправак Мінскай вобласці. Вось і цяпер мастак працуе: збірае з дэталяў легкавых і грузавых машын чарговы арт-аб'ект — вялікую па памеры і вазе рыбу, а менавіта — сома. Даведаўшыся пра новы праект, я паспяшаўся ў творчую майстэрню дэкаратыўных вырабаў. Там разам з сынам Арцёмам, прафесійным скульптарам Стасам Шашковым і электразваршчыкам Дзмітрыем Пякарскім (усе яны ёсць на здымках) аўтар праекта прымацоўваў апошнія дэталі, быццам наносіў апошнія штрыхі на гатовы твор.

— Сом — галоўная фігура кампазіцыі «Рыбачок», якая хутка з'явіцца на новай АЗС у курортным пасёлку Нарач Мядзельскага раёна, — кажа Уладзімір Канонік. — Побач будзе яшчэ вялікая вуда, і кожны, хто возьмецца за яе, стане падобны на шчасліўчыка, які злавіў гэтую рыбіну. Вось у чым сэнс інтэрактыўнай кампазіцыі.

А яшчэ аўтар паведаміў, што на стварэнне пяціметровага нарачанскага сома пайшоў цэлы месяц і амаль тысяча аўтазапчастак, а вага рыбы не меншая за паўтары тоны.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Больш фота глядзіце на сайце zviazda.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении повторного открытого аукциона по продаже права заключения договора аренды недвижимого имущества

Организатор аукциона	открытое акционерное общество «Солигорскторг», г. Солигорск, ул. Л. Комсомола, 44
Дата, время и место проведения аукциона	04.10.2019, в 12:00, актовый зал
Лот № 1	
Предмет аукциона	**право заключения договора аренды недвижимого имущества – часть капитального строения с инвентарным номером 644/С-3766 (магазин № 35)**
Общая площадь, кв. м	2 944,20
Местонахождение недвижимого имущества	Минская область, г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 63
Характеристика недвижимого имущества и иные сведения	оборудовано центральным отоплением, водоснабжением, электроснабжением, канализацией, охранной сигнализацией, имеются складские помещения, погрузочно-разгрузочные рампы, подъездные пути
Условия аукциона	**целевое использование имущества – для осуществления розничной торговли продовольственными и (или) непродовольственными товарами и (или) оказания услуг;** **выполнение за счет средств арендатора (без последующей компенсации затрат арендодателем, в том числе и после прекращения договора аренды) капитального ремонта арендуемых помещений, который включает в себя: ремонт изношенных элементов внутренних и наружных инженерных сетей, установок противопожарной автоматики, систем противодымной защиты и внутреннего противопожарного водопровода, работы по заделке выбоин, трещин в цементных, бетонных полах, восстановление штукатурки и облицовки стен и потолков, смене отдельных участков трубопроводов, секций отопительных приборов, гидравлические испытания системы теплоснабжения, благоустройство прилегающей территории**
Начальная цена права заключения договора аренды объекта, руб.	2 487,85
Сумма задатка, руб.	248,00
Срок договора аренды	5 лет
Размер ежемесячной арендной платы за арендуемые помещения, базовых арендных величин	1 766,52
Размер штрафа, уплачиваемого участником аукциона в предусмотренных законодательством случаях, руб.	2 550,00

Порядок проведения аукциона и условия участия в аукционе определяются Гражданским кодексом Республики Беларусь, Положением о порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в собственности ОАО «Солигорскторг», утвержденным решением наблюдательного совета (протокол № 3 от 12.04.2019).

1. Для участия в аукционе необходимо представить следующие документы:

1.1. заявление на участие в аукционе по установленной форме;

1.2. копию документа, подтверждающую государственную регистрацию юридического лица либо индивидуального предпринимателя;

1.3. документ, подтверждающий внесение задатка на расчетный счет ОАО «Солигорскторг» (УНП 600122715) — р/с BY91AKBB30120128800126600000 в филиале № 633 ОАО «АСБ «Беларусбанк», г. Солигорск, ул. Козлова, 23А, код BIC AKBBBY21633, с отметкой банка;

1.4. лицо, желающее принять участие в аукционе, заключает с ОАО «Солигорскторг» соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по установленной форме;

при подаче заявления и заключении соглашения организатору аукциона предъявляются: представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал доверенности (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя; физическим лицом, индивидуальным предпринимателем – документ, удостоверяющий личность.

2. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе аукциона наивысшую цену.

3. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона) обязан:

подписать протокол аукциона в день его проведения;

в течение 3 рабочих дней со дня его проведения перечислить на расчетный счет арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка, а также возместить организатору аукциона затраты на его организацию и проведение;

подписать договор аренды недвижимого имущества в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона и подписания протокола аукциона.

